

ШТО РАБІЦЬ СА ЗНОЙДЗЕНЫМІ РЭЧАМІ? 5

ДЫРЫЖОР АЛЯКСАНДР АНІСІМАЎ АБ ПРАФЕСІІ І ЖЫЦЦІ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

28 ВЕРАСНЯ 2019 г. СУБОТА № 185 (29052)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Дзмітрый КРУТОЙ, міністр эканомікі:**

*«Беларусь вядзе актыўную работу па ўваходжанні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Сёння мы ўжо практычна на фінішнай прамой і спадзяёмся, што на XII Міністэрскай канферэнцыі СГА ў чэрвені 2020 года ў Нур-Султане мы гэты працэс завершым і станем паўнавартасным членам арганізацыі».*

# ПРЫГАЖОСЦЬ — НА АЙЧЫННЫ РЫНАК

## Аляксандр Лукашэнка расказаў, які бізнес будзе мець поспех у Беларусі

**Яшчэ класік пісаў пра выратавальную сілу прыгажосці. Пацвярджэнне гэтаму можна знайсці і ў кантэксце сучаснай беларускай эканамічнай рэальнасці. Прыгажосць (калі дакладней — касметычная індустрыя) выратавала сельскагаспадарчае прадпрыемства. У 2004 годзе генеральнаму дырэктару закрытага акцыянернага таварыства «Вітэкс» Віктару ЦЯРЭШЧАНКУ прапанавалі ўзяць пад шэфства стратную гаспадарку ў вёсцы Цеплень Узддзенскага раёна. Прадпрымальнік, які ў той час заваёўваў касметычныя рынкі, спачатку адмовіўся, але потым усё ж такі пагадзіўся з прапанаваў і ператварыў сельскагаспадарчы комплекс у аднаго з лідараў сярод гаспадарак Мінскай вобласці. Паглядзець, як ідуць справы ў вытворчасці касметычнай прадукцыі, і паслухаць, якім чынам наладжана работа ў аграпрамысловым сектары кампаніі, учора на вытворчасць прыехаў Прэзідэнт.**

### Маладзільныя яблыкі і лекавыя травы

«Гэта была самая горшая гаспадарка па паказчыках не толькі ў Мінскай вобласці, але і нават адна з найгоршых ва ўсёй рэспубліцы», — успамінае генеральны дырэктар «Вітэкса».

Сельскагаспадарчы комплекс, як паведаміў ён, не зусім карэктна называць падшэфнай гаспадаркай. Гэта аграрны сектар эканомікі, які знаходзіцца ў складзе прадпрыемства «Вітэкс», быццам яшчэ адзін цэх.

За 15 гадоў на комплексе дасягнулі значных вынікаў. Па надоях малака ў 2016 годзе ўстанавілі свой рэкорд — больш за 10 тон на карову. Калі «Вітэкс» толькі ўзяўся за гаспадарку на Уздзеншчыне, гэтыя паказчык быў у 10 разоў ніжэйшы. У гаспадарцы займаюцца яшчэ раслінаводствам, садаводствам, перапрацоўкай садавіны і агародніны ў сокі. СТАР. 2



Фота БелТА.

КОРАТКА

- **Міністэрства фінансаў рыхтуе новы праект указа з адвязкай дзяржпошліны ад тэхагляду і магчымасцю плаціць па месяцах.**



- З 1 кастрычніка аб'явы аб рабоце за мяжой не трэба будзе ўзгадняць з МУС.
- **Міністэрства юстыцыі спыніла дзеянне ліцэнзіі агенцтва нерухомасці «Вікторыя».**
- Канцэрт для немаўлят і цяжарных жанчын «Музыка твайго сэрца» адбудзецца 4 кастрычніка падчас фестывалю Юрыя Башмета ў КЗ «Верхні горад».
- **На турніры ў кітайскім Ухані Арына Сабаленка абыграла першую ракетку свету аўстралійку Эшлі Барці (7:5, 6:4) і выйшла ў фінал. Летась яна там перамагла.**
- Супрацоўнікі Мінскай рэгіянальнай мытні выявілі ў паштовых адпраўленнях больш за 750 прамочаных ЛСД марак.

Свята ў хату!

# ЖЫВЫ КУТОК ВЯЛІКАГА ГОРАДА

## Радасці і клопаты найстарэйшага ў краіне Гродзенскага заапарка, якому споўнілася 90 гадоў




**Сёння ад старога заапарка не засталося і следу. Вось ужо сем гадоў, як тут усё поўнасцю аднаўлена. Літаральна ўсё. Заапарк цалкам перабудаваны, усе старыя вальеры і памяшканні знесены, на іх месцы выраслі цікавыя па канструкцыі, акуратныя домікі. З'явіліся вадаёмы, атракцыёны, інфраструктура. Карацей, сучасная рэкрэацыя для фаўны ў цэнтры горада... Адзінае, што засталося ранейшым, — цікавасць жыхароў і гасцей Гродна.**

### АДБУДАВАНЫ НАНОВА

З **дырэктарам Алегам ЖДАНКІНЫМ** аглядаем тэрыторыю. Выказваю думку, што ндрэнна было б падчас рэканструкцыі яшчэ больш пашырыць заапарк, за яго тэрыторыяй зямля пустуе.

— Тут нічога не зменіш, гэта планавыя пабудовы, тэрыторыя таксама акрэслена — крыху больш за пяць гектараў. Сапраўды, была ідэя працягнуць яго далей, пашырыць, але генеральны план горада прадугледжвае вуліцу і дарогу да чыгуначнага вакзала. Таму ў той бок пашырацца нельга. Мы можам развівацца толькі ў плане калекцыі, — тлумачыць дырэктар.

Новая эра змяніла і саму канцэпцыю заапарка. Гэта не проста ідовішчны аб'ект, але яшчэ і месца для адпачынку. Чалавек прыходзіць сюды, не толькі паназіраць за жывёламі, але і пачаставацца ў кавярні, адпачыць. Тут створаны прыгожы зялёны ландшафт, вадаёмы з прыгожымі мосцікамі, зручныя лаўкі і альтанкі. СТАР. 12

Ёсць праблема

# ДЫЕТА НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

## Як жыве хлопец з рэдкай генетычнай хваробай і чаму такія, як ён, не маюць належнай дапамогі

**Мінчанін Дзмітрый ЖЫЗНЕЎСКІ амаль нічым не адрозніваецца ад маладых людзей свайго ўзросту: вучыцца ў лінгвістычным каледжы, пасля пар наведвае заняткі ў аўташколе і трэнажорную залу. Акрамя адной асаблівасці: амаль уся ежа, якую ўжываюць звычайныя людзі, для хлопца смяротна небяспечная. У яго рэдкае генетычнае захворванне, з-за чаго з нараджэння ён вымушаны прытрымлівацца жорсткай дыеты. Большая частка яго рацыёну складаецца са спецыялізаванага лячэбнага харчавання — амінакіслотных сумесяў. Многіх звыклых для нас прадуктаў, напрыклад, мясных, ён не ведае на смак. Пры гэтым малады чалавек мае інваліднасць і бясплатна атрымліваў лячэбнае харчаванне толькі да 18 гадоў. Пасля пажыццёвае захворванне засталося, а ўсё астатняе — не.** СТАР. 7



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

ISSN 1990 - 763X

19185

# ПРЫГАЖОСЦЬ — НА АЙЧЫННЫ РЫНАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З лекавых траў, якія вырошчваюць на землях «Вітэкса», і прадуктаў пчалаводства ствараюць інградыенты для касметычнай вытворчасці. Толькі з траў атрымліваюць 150—170 відаў экстрактаў. Тэхналогіі і вопыт сельскай гаспадаркі калісьці Віктар Цярэшчанка пераймаў у ізраільскіх спецыялістаў.

Дасягнуць такіх вынікаў, як расказаў гендырэктар, магчыма толькі прытрымліваючыся тэхналогій: рэцэптуры ў кармленні жывёл, своечасовай апрацоўкі і ўгнаення раслінных культур. І вядома, тут ніяк без падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў. Пра неабходнасць жорстка прытрымлівацца тэхналогій на адной з ферм, як і агульнавядомай адначасова гаспадаркам, тут пасведчыла Віктар Цярэшчанка.

**● Каментарый у тэму**

**Віктар ЦЯРЭШЧАНКА, генеральны дырэктар ЗАТ «Вітэкс»:** «Мы практычна за 30 гадоў з нуля прыйшлі да гэтага ўзроўню і дасягнулі статусу самага вядомага прадпрыемства ў сферы касметычнай галіны не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй постсавецкай прасторы. Мы нават канкуруем са шматлікімі еўрапейцамі ў вытворчасці касметыкі. Калі пачыналі, запазычвалі ўсе распрацоўкі. Сёння комплексна вырашаем усе пытанні — ад распрацоўкі да рэалізацыі. Для гэтага ў нас ёсць свой навуковы цэнтр, які распрацоўвае 100—120 відаў прадукцыі штогод, і мы іх укараняем. У нас ёсць уласная вытворчасць упакоўкі, чым мы адрозніваемся ад іншых вытворцаў касметыкі. Маючы на балансе свой сельскагаспадарчы комплекс, мы рыхтуем свае інградыенты, якія выкарыстоўваем у касметыцы. Такім чынам стараемся, каб наша касметыка больш набліжалася да натуральнай».

Пра неабходнасць жорстка прытрымлівацца тэхналогіі на адной з ферм нагадваў і Аляксандр Лукашэнка, таму не дзіўна, што ён высока ацаніў сельскагаспадарчыя дасягненні прадпрымальніка.

«Заўсёды ў прыклад цябе прыводжу як бізнесмена добрага. Ты калісьці не хацеў браць (гаспадарку. — **«Зв.»**), а потым аддаваць не хацеў назад. І думаю, трэба ж паглядзець, як яно. Малайчына, вельмі добра. Людзі ў цябе там вельмі задаволеныя, асабліва адносінамі», — канстатаваў лідар краіны.

«Ну а ўвогуле, тыя гаспадаркі, якія мы калісьці хваляй замацавалі, толькі чатыры назад забралі. А так, прыватнікі вельмі добра распарадзіліся гэтымі гаспадаркамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Звярнуўся Віктар Цярэшчанка да Прэзідэнта і з праблемамі. Па словах кіраўніка ЗАТ «Вітэкс», працэдура з адводам зямель цяпер занадта доўгая. «Надакучыла ўжо слухаць гэтыя прэтэнзіі, — абурыўся кіраўнік дзяржавы і даў даручэнне разабрацца з сітуацыяй. — Кіраваная краіна, а мы не можам вырашыць гэтае пытанне».

Прадпрымальнік звярнуўся за дапамогай, каб забяспечыць магчымасць прадаваць на адной пляцоўцы прадукты харчавання і касметычныя сродкі, калі яны ў закрытай упакоўцы. У крамах сеткі «Вітэкс» кантралюючыя органы робяць заўвагі. «Гэта бардак поўны. Мы ўжо пра гэта казалі, наводзячы парадак на вытворчасці. Чым адрозніваецца цюбік з пастай ад шкляной ці іншай тары?» — пагадзіўся Прэзідэнт.

## Бізнес па-беларуску

Каб даведацца, ці так жа пасняхова як з аграпрамысловасцю ідуць справы з касметыкай, Прэзідэнт адправіўся ў цэхі прадпрыемства. Там ён азнаёміўся з працэсам вытворчасці прадукцыі, яе асартыментам.

«Беліта» — гэта сумеснае беларускаітальянскае прадпрыемства, каля вытокаў якога стаяў старшыня праўлення Віктар Цярэшчанка. Кампанія «Вітэкс» — іншая юрыдычная асоба. Гэта першыя касметычныя прадпрыемствы краіны, якія разам з гандлёвымі дамамі і рэгіянальнымі прадстаўніцтвамі выступаюць на рынку як адна вялікая сетка. Прадукцыя прадстаўлена больш чым у 30 краінах свету. Экспарт складае 59 % у агульным аб'ёме паставак. Ствараюць на прадпрыемстве звыш 2000 прэпаратаў.

Прэзідэнт, азнаёміўшыся з асартыментам і якасцю прадукцыі, заклікаў карыстацца айчыннай касметыкай. Звярнуўся па кансультацыю, што больш за ўсё папулярна і запатрабавана ў беларускіх жанчын, да кіраўніка сваёй Адміністрацыі Наталлі Качанавай. А пра некаторыя найменні, прадстаўленыя на выстаўцы, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што і сам карыстаецца гэтымі сродкамі.

Кіраўнік дзяржавы звярнуўся таксама да суправаджаючых яго асоб і журналістаў з парадай выкарыстоўваць беларускія касметычныя сродкі. І распарадзіўся падараваць прысутным «за свой кошт» па сродку з лінеек «Вітэкса».

Лідар краіны падчас наведвання вытворчасці пацікавіўся, ці закупляюць айчынную касметыку гасцініцы. Супрацоўнікі адзначылі, што, магчыма, іх прадукцыя не самая танная для гасцінічнага сектара.

«Яны купляюць таксама нятаннае. З Японіі ім прывязуць, танней не прададуць, — заўважыў Прэзідэнт. — Гэта бязладдзе наша агульнае. Замест таго, каб сваё браць... У іх жа добрая прадукцыя. А ўвогуле, ніякія японцы, ізраільцяне лепш не ствараюць. Усё прыкладна аднолькавае. Але гэта прадукцыя з мясцовай сыравіны».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў кагосьці ёсць інтарэс па пастаўках касметычнай прадукцыі ў нашы гасцініцы, таму айчынныя вытворцы не прадаюць туды свае тавары, і загадаў разабрацца з праблемай.

Прэзідэнт высока ацаніў дасягненні прадпрыемства і назваў кампанію «Вітэкс» прыкладам таго бізнесу, які патрэбна мець у Беларусі: «У яго і на зямлі добрая справа, у яго ёсць і асноўная вытворчасць. Ён можа манеўраваць, дзесьці падтрымаць іх, дзесьці перакрыжавана фінансаваць. Вёсачка, сад, людзі жывуць добра і сам (генеральны дырэктар Віктар Цярэшчанка. — **«Зв.»**) прыязджае туды душой адпачываць. І гэта правільна. У Беларусі менавіта такім чынам трэба і дзейнічаць».

Закрануў Аляксандр Лукашэнка і праблему з доглядам тэрыторыі і азеляненнем сталіцы. Праехаўшыся па Мінску, ён звярнуў увагу на наяўнасць адкосаў і яроў: «Людзі ходзяць на такім адкосе, абкошваюць траву тры разы на год. Навошта? Калі вы лянівыя такія, пасадзіце там (як у Кітаі) кусты, кветкі».

Работы ў гэтым кірунку трэба правесці на працягу восені і даць адпаведныя даручэнні кіраўнікам раённых адміністрацый Мінска.

**Марыя ДАДАЛКА.**

---

Эканамікс

# БОЛЬШ ЗА 110 МАШЫН У ЗМЕНУ

## Складаная тэхніка прынесла сёлета краіне ўжо каля трох мільярдаў долараў экспартных грошай


Фота БелТА.

**Усяго ў галіне машынабудавання ў нашай краіне налічваецца каля 200 прадпрыемстваў, на якіх працуюць больш за 150 тысяч чалавек. Лінейка выпрабленай прадукцыі вельмі шырокая: ад мікрасхем і клапанаў сэрца да самых вялікіх у свеце кар'ерных самазвалаў. Мы экспартуем каля 70 % прадукцыі, якую выпускаем, пастаўкі ажыццяўляюцца больш чым у 100 краін свету, паведаміў першы намеснік міністра прамысловасці Генадзь СВІДЗЕРСКІ.**

### ГАЛОЎНАЕ — ПРЫБЫТАК

З пачатку года выраблена прадукцыі больш чым на 9 млрд рублёў, большая частка яе экспартуецца як у Расію, іншыя краіны СНД, так і ў далёкае замежжа. Атрымана станоўчае сальда знешняга гандлю. Усяго за сем месяцаў гэтага года экспартавана тавараў на суму больш за 2,5 млрд долараў, чакаецца вынікі васьмі месяцаў — каля 3 млрд долараў. Гэта адпавядае ўзроўню 92 % да аналагічнага перыяду мінулага года.

Паводле слоў першага намесніка міністра, на вынік паўплывала дэвальвацыя расійскага рубля, таму што пастаўкі ацэньваюцца ў доларавым эквіваленце. «У фізічных аб'ёмах мы спрацавалі практычна на 100 %. Пакуль не дасягнулі прагнознага паказчыка, але распрацоўваюцца дадатковыя мерапрыемствы для выхаду на тэмп росту, больш за леташні», — дадаў намеснік міністра.

Акрамя таго, эфектыўнасць работы на замежных рынках залежыць ад кан'юнктуры цэн. Так, у цяперашні час назіраецца патаненне металургічнай прадукцыі ў сувязі з прыходам на еўрапейскі рынак кітайскіх вытворцаў. Больш аб'ектыўны паказчык для галіны — доля рынку, і яе прадпрыемствы не страцілі ні ў металургіі, ні ў трактарабудаванні, ні ў аўтамабілебудаванні.

А галоўнае, што прадпрыемствы спрацавалі з прыбыткам больш за 300 млн рублёў. Выкананне паказчыка па рэнтабельнасці продажаў у прамысловасці па арганізацыях з доляй дзяржавы 50 % і больш склала за сем месяцаў года 6,6 %. Сярэднямесячная заработная плата па Мінпраме ў цэлым дасягнула 1096 рублёў.

### У НОВЫМ ГОДЗЕ ВЫПУСЦІМ 35 ТЫСЯЧ GEELY

Айчынны вытворца легкавых аўтамабіляў СЗАТ «БелДжы» практычна выйшаў на намінальную магутнасць. У 2020 годзе на прадпрыемстве плануецца выпусціць 30—35 тысяч машын і пашырыць геаграфію экспарту. Чакаецца, што 10 тысяч аўтамабіляў набудуць для мясцовых спажыўцоў, а 20—25 тысяч машын накіруюцца за мяжу.

Калі сёлета прадукцыя пастаўлялася ў асноўным у Расію, то налета прадпрыемства разлічвае таксама выйсці на рынкі Казахстана, Арменіі, Украіны, Літвы. «Такія перагаворы вядуцца, — адзначыў Генадзь Свідзерскі. — Пераканаюцца, што геаграфія паставак пашырыцца». План на 2020 год у карпарацыі Geely мяркуецца зацвердзіць у лістападзе.

Выхад на праектную магутнасць дазволіў прадпрыемству па выніках дзевяці месяцаў гэтага года выйсці на чысты прыбытак, які склаў больш за 20 млн рублёў, разлічыцца па ўсіх абавязацельствах з банкамі. Узровень рэнтабельнасці продажаў у сярэднім дасягае 4,9—5,2 %.

«Для старту гэта добрыя паказчыкі, — лічыць Генадзь Свідзерскі. — Вырашылі сабе да Дня машынабудаўніка паднесці падарунак — у гэтым месяцы выпусцім звыш дзвюх тысяч машын, працуючы ў адназменным рэжыме. Завод запраектаваны на выраб 120 аўто за змену, на сённяшні дзень выпускаем 100—110 машын, што практычна адпавядае вытворчай магутнасці».

Усяго з пачатку гэтага года выпушчана больш за 12 тысяч аўтамабіляў, з іх 11 тысяч прададзена. Беларускім дылерам пастаўлена 40 % прадукцыі, на экспарт у Расію — 60 %. Найбольшым попытам карысталася мадэль Atlas (на яе прыйшлася палова продажаў). Доля Emgrand X 7 — 30 %, Emgrand 7 — 20 %. Каля 70 % пакупнікоў — фізічныя асобы, палова з іх скарысталася партнёрскімі банкаўскімі праграмамі. Па выніках гэтага года ў Беларусі плануецца рэалізаваць больш за сем тысяч машын.

Продаж і абслугоўванне аўтамабіляў ажыццяўляецца праз разгалінаваную дылерскую сетку. Нядаўна сэрвісны цэнтр адкрылі ў Кобрыне. Плануецца адкрыццё станцый сэрвіснага абслугоўвання ў Баранавічах і Пінску. У Расіі створана звыш 50 дылерскіх цэнтраў.

### БОЛЬШ ЭКАЛАГІЧНЫ РУХАВІК — НЕ ЗА ГАРАМІ

У будучыні наш мясцовы вытворца легкавых аўтамабіляў мае намер выпускаць аўтамабілі класа Еўра-6. Першы ўзор прадпрыемства разлічвае прадставіць ужо ў 2020 годзе.

«Вырашаем гэтае пытанне дваяк. З аднаго боку, можна пераабсталяваць легкавы аўтамабіль для работы на газе, і ён будзе адпавядаць патрабаванням Еўра-6. А ёсць мадэлі, якія выкарыстоўваюць рухавікі гэтага класа. Па «БелДжы» запланавана, што Atlas налета будзе мадэрнізавацца да ўзроўню Еўра-6». Такая прадукцыя можа быць запатрабавана, у прыватнасці, у балканскіх краінах.

У цяперашні час на прадпрыемстве вырабляюцца аўтамабілі класа Еўра-5. Засвоены серыйны выпуск трох мадэляў 28 мадыфікацый. Нам яшчэ трэба будзе вырашыць шмат пытанняў як з пункту гледжання абнаўлення мадэльнага шэрагу, так і з пункту гледжання сэрвісу. Цяпер праводзіцца штокварталны аўдыт дылерскай сеткі, наладжана сістэма кантролю і ацэнкі якасці абслугоўвання кліентаў. Па кароткім нумары 138 працуе даведачна-інфармацыйная служба. Завяршаецца супраца з мабільным аператарам, каб ва ўмовах пастаўкі на 2020 год мультымедыйная сістэма мела SIM-карту і пры ініцыяцыі падтрымлівала 4G-праграмы музыкі і навігацыі».

У адпаведнасці з тэхнічным планам завода да канца года запланавана вытворчасць установачнай партыі новай мадэлі — Geely SX11. Яна распрацавана Geely сумесна з Volvo на новай модульнай платформе, мае спартыўны экстэр'ер і інтэр'ер. Яшчэ адна навінка — седан Geely GE прадстаўнічага класа.

**На пастаўкі ў краіны далёкага замежжа прыйшлося 30 % агульнага аб'ёму экспарту. Доля рынку ЕАЭС вырасла за кошт паставак у Казахстан і Арменію. У параўнанні з аналагічным перыядам 2018 года ў 1,4 раза павялічаны пастаўкі ў краіны Афрыкі. Пробныя партыі адпраўлены ў дзевяць краін, куды не было экспарту ў студзені—ліпені 2018 года. У іх ліку Ліван, Бенін, Чылі, Тога, Уганда і іншыя краіны.**

### ТАННЫ ATLAS У СМАЛЕНСКУ — ПАДМАН І ФАЛЬСІФІКАЦЫЯ

Генадзь Свідзерскі адказаў на пытанне, чаму нашы машыны ў Беларусі даражэйшыя, чым у Смаленску. «Афіцыйна хачу заявіць, што не ўсе сайты дакладныя. Паведамленні, што ў Смаленску можна купіць наш аўтамабіль на 40 % танней, — падман і фальсіфікацыя. Цэнавая палітыка каардынуецца Geely, і прэйскурант афіцыйнага сайта кампаніі ў Расіі і Беларусі практычна не адрозніваецца», — падкрэсліў ён.

Тыя, хто выстаўляе ніжэйшую цану, не з'яўляюцца афіцыйнымі дылерамі. Гэтыя кампаніі не раз перарэгістраваліся для таго, каб працягваць падман. Разам з тым, сапраўды, цана адгрузкі прадукцыі атрымліваецца на 20 % меншай пры пастаўках у Расію за кошт нулявога ПДВ (яго грамадзянін аплачвае пры куплі). «Пры экспарце гэтая накладная не з'яўляецца накладной для пакупніка», — адзначыў Генадзь Свідзерскі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЗАЎСЁДЫ Ў СТРАІ

## У Беларусі ўдзяляецца сур'ёзная ўвага падтрымцы грамадскіх арганізацый

**Гэта на сустрэчы з актывам Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў адзначыла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА. Мерапрыемства адбылося напярэдадні Дня пажылых людзей, які святкуюць 1 кастрычніка.**


Фота БелТА.

Прадстаўнікі грамадскага аб'яднання ветэранаў рэалізуюць праекты па патрыятычным выхаванні моладзі, падтрымцы адзінокіх пажылых грамадзян, святкаванні 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«Хачу падзякаваць вам за працу, — перадае словы Наталлі Качанавай БелТА. — Усе кірункі вашай дзейнасці значныя. На з'ездзе прафсаюзаў Прэзідэнт дакладна сказаў, што грамадскія арганізацыі — тая апора, на якой трымаецца дзяржава. Прафсаюзныя, ветэранскія, маладзёжныя, жаночыя і іншыя аб'яднанні працуюць на карысць краіны, народа».

Штогод у Адміністрацыю Прэзідэнта прыходзіць больш за 25 тысяч зваротаў — усе праблемныя моманты знаходзяцца на кантролі ведамства.

«Людзі пішуць, шукаюць дапамогі і падтрымкі ў Прэзідэнта, але ж ёсць маса кіраўнікоў на месцах, якія могуць і павінны вырашаць пытанні. Калі вы гэта бачыце, своечасова інфармуйце», — звярнулася да ветэранаў Наталля Качанава.

Нагадалі на сустрэчы і аб электаральнай кампаніі. Традыцыйна Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў прымае актыўны ўдзел у выбарах і вылучае сваіх членаў у выбарчыя камісіі.

Аты-баты

### Вайскоўцы вяртаюцца з вучэнняў

**Апошнія залпы падчас сумеснага расійска-беларускага вучэння «Шчыт Саюза — 2019», якое праходзіла на палігоне Муліна, адгрымелі больш за тыдзень таму. Нашы салдаты і афіцэры паказалі на іх добрыя вынікі. Кіраўніцтва Узброеных Сіл як Беларусі, так і Расіі высока ацаніла іх дзеянні. Цяпер вайскоўцы працягваюць вяртацца з Расіі ў нашу краіну.**

Эшалоны 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады пачалі прыбываць на станцыю Азярышча.

— Нас цёпла прынялі ў Расіі, дапамаглі з інжынерным уладкаваннем камандных пунктаў і пазіцый, — расказаў **намеснік камандзіра брыгады гвардыі падпалкоўнік Міхаіл СКІБА.** — Нашы вайскоўцы паказалі высокія вынікі. Але было няпроста прызвычаіцца да глебы — мясцовасць у Муліне вельмі пясчаная.

Таксама ў Беларусь вярнуліся ваеннаслужачыя 742-га палявога вузла сувязі. Як адзначыў яго начальнік, **падпалкоўнік Вадзім КАЗЛІЦІН,** асабовы склад з усімі пастаўленымі задачамі справіўся.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Сезон

## Стартуе загоннае паляванне на капытных

**З 1 кастрычніка і да 31 снежня паляваць на лася, дзіка, казулю, аленяў — высакароднага і плямістага, лань, муфлона можна будзе загонам і з сабакамі ў светлы час сутак, а з засады і з падыходу — на працягу сутак. Дазволена здабываць жывёл любога полу і ўзросту.**

У Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь нагадалі, што для здабычы лася, аленя, лані, дарослага дзіка (старэйшага за два гады) неабходна выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 3000 джоўляў, а для здабычы казулі і маладняка дзіка (да двух гадоў) — наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоўляў. У абодвух выпадках можна таксама выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі з куляй, паляўнічыя лукі і арбалеты пэўных параметраў. Пароды сабак, якім дазволена ўдзельнічаць у гэтых паляваннях, вызначаюцца па рашэнні кантралюючых паляўнічых угоддзяў.

У мэтах бяспекі забараняецца праводзіць загоннае паляванне ў змрокy, у тумане, у моцны снегапад, ва ўмовах дрэннай бачнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Я зноў выбіраю!

## Пад заслону верасня

### «Звязда» знайшла новых прыхільнікаў

**Дзень падпісчыка ладзіцца ў Гродне кожны квартал. Чарговае мерапрыемства завяршае год і падводзіць вынікі падпісной кампаніі.**



Кожнае выданне зацікаўлена ў тым, каб павялічыць колькасць сваіх падпісчыкаў. Таму мерапрыемства ладзіцца сумеснымі намаганнямі — пошты і рэдакцыяй газет. Звычайна для правядзення выбіраюцца найбольш ажыўленыя месцы. Як расказаў **вядучы інжынер аддзела эксплуатацыі паштовай сувязі і распаўсюджвання друку Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Ігар ПАВАЙБА,** дзень падпісчыка быў арганізаваны на буйных прадпрыемствах, у школах, на цэнтральных плошчах, нават на самым папулярным рынку. Апошнім часам свята праходзіць падчас фестывалю пошты. Гэта новы фармат узаемадзеяння пошты і СМІ.

Сёлетні дзень падпісчыка адбыўся ў будынку цэнтральнага аддзялення паштовай сувязі, а напярэдадні ладзілася мерапрыемства ў музеі пошты. Гэтая ўстанова адкрылася зусім нядаўна і адлюстроўвае гісторыю паштовай сувязі ў рэгіёне. Дарэчы, нядаўна каля цэнтральнага аддзялення з'явілася фігура паштальёна разам з катом. Няцяжка здагадацца, што гэта за персанажы.

Падчас дня падпісчыка ў «Звязды» знайшліся новыя прыхільнікі, якія аформілі падпіску на квартал. Таксама наведвальнікі цікавіліся і шматлікімі іншымі выданнямі Выдавецкага дома «Звязда» — напрыклад, часопісамі «Вожык», «Полымя», «Нёман», «Маладосць», «Алеся», «Родная прырода».

**Маргарыта УШКЕВІЧ , фота аўтара.**

Здарэнні

## СКРАЛА КАЛЫСКУ, КАБ... ПАДАРЫЦЬ УНУКУ

**У сталічную міліцыю з заявай аб знікненні звярнуўся бацька сямейства, які напярэдадні пакінуў яе каля пад'езда. Малады бацька вырашыў, што за пару гадзін нічога не адбудзецца, але вярнуўся па дзіцячы транспарт толькі раніцай.**

Аператыўнікі ўстанавілі, што калыску забрала жанчына, якая пражывае ў адным доме з пацярпелым. Прапажу праваахоўнікі знайшлі на лесвічнай клетцы каля кватэры пенсіянеркі. Жанчына патлумачыла супрацоўнікам міліцыі, што ўбачыла безгаспадарную калыску каля пад'езда і вырашыла забраць сабе, таму што ў яе нядаўна нарадзіўся ўнук, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Кошт скрадзенага склаў 700 рублёў.

Міліцыя настойліва рэкамендуе пры выяўленні якой-небудзь маёмасці на тэрыторыі гандлёвых цэнтраў, устаноў адукацыі і аховы здароўя, у транспарце, на тэрыторыі дзіцячых пляцовак перадаваць яе кіроўцу, работнікам адміністрацыі, у найбліжэйшы орган унутраных спраў. Гэта звязана з тым, што часцей за ўсё аб'ектам крадзяжу робіцца рэчы, пакінутыя без нагляду. Грамадзяне памылкова думаюць, што могуць прысвойваць сабе знойдзеныя кашалькі, грошы, сумкі, веласіпеды і калыскі.

## ПАД СЯКЕРУ — 100-ГАДОВЫЯ ДУБЫ

**Індывідуальны прадпрымальнік з Гродна набыў права на нарыхтоўку драўніны ў Гожскім лясніцтве непадалёк ад абласнога цэнтра.**

Як расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, з-за малой адлегласці да буйнога населенага пункта лясныя насаджэнні тут адносяцца да катэгорыі рэкрэацыйна-аздараўленчых. Ад высечкі, які быў дазволены прадпрымальніку, — прыборка захламленасці, іншымі словамі, чыстка лесу ад сухастойных, валежных і ветравальна-бураломных дрэў.

Аднак мужчына вырашыў спілаваць яшчэ і 26 не прызначаных для высечкі здаровых дрэў розных парод. Пад сякеру пайшлі два стагадовыя дубы-волаты сярэднімі дыяметрамі каля пня 110 і 86 сантыметраў адпаведна. Парушэнне выявілі супрацоўнікі Гродзенскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Яны ўстанавілі, што прадпрымальнік незаконна нарыхтаваў больш за 21 кубаметр драўніны. Прычыненая шкода ацэньваецца ў 10,4 тысячы рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Францыя прадставіць новую мадэль партнёрства з Афрыкай



Парыж плануе прадставіць новую мадэль раўнапраўнага партнёрства з краінамі Афрыкі летам 2020 года ў Бардо. Пра гэта паведаміў міністр замежных спраў Францыі Жан-Ів Ле Дрыян на пасяджэнні Савета Бяспекі ААН. «Афрыка не чакае ад нас шчодрасці, Афрыка чакае ад нас партнёрства. Францыя гатовая выстройваць устойлівае эканамічнае партнёрства з Афрыкай на роўных, інвеставаць у прыватны сектар, у інавацыі і моладзь, — адзначыў ён. — Такая логіка калектыўнага партнёрства, на наш погляд, можа спатрэбіцца і ў сферы калектыўнай бяспекі». У якасці прыкладу эфектыўнасці такога падыходу Ле Дрыян прывёў Судан, Кувейт, Цэнтральна-Афрыканскую Рэспубліку, Сахель і саміт дзяржаў — членаў Эканамічнай супольнасці краін Заходняй Афрыкі, які прайшоў ва Уагадугу. Па яго выніках быў зацверджаны план дзеянняў аб'ёмам $1 млрд, накіраваны на барацьбу з тэрарызмам у рэгіёне.

### Саудаўская Аравія ўпершыню пачынае выдаваць турыстычныя візы



Як паведаміла агенцтва Reuters, візу ў каралеўства можна будзе набыць анлайн за $80, пры гэтым доступ у мусульманскія святыні Мекку і Медыну для турыстаў будзе абмежаваны. Адзначаецца, што забарона на ўжыванне алкаголю, якая існуе ў каралеўстве, будзе таксама пашырацца на турыстаў. Пры гэтым нашэнне абаі (арабскай сукенкі з доўгімі рукавамі, як правіла чорнага колеру) для жанчын не будзе абавязковым, дастаткова будзе «сціплай адзежы», у тым ліку і на грамадскіх пляжах. Жанчыны без суправаджэння сваякоў мужчынскага полу таксама змогуць наведаць каралеўства. Улады робяць стаўку на развіццё турыстычнай галіны. Паводле ацэнак спецыялістаў, турсектар будзе спрыяць дыверсіфікацыі эканомікі і памяншэнню яе залежнасці ад экспарту энергарэсурсаў. Каралеўства плануе да 2030 года выйсці на ўзровень 30 млн прыездных у год. Цяпер гэтая лічба складае 16 млн чалавек, прычым турыстаў сярод іх няма, але ўжо ў найбліжэйшы час Саудаўская Аравія разлічвае атрымліваць штогод $47 млрд даходаў ад турызму.

### Больш за мільярд чалавек сутыкнуцца з катаклізмамі з-за пад'ёму ўзроўню акіяна



Да 2050 года звыш мільярда чалавек штогод будуць сутыкацца з цыклонамі, паводкамі і іншымі надзвычайнымі сітуацыямі прыроднага характару ў выніку пад'ёму ўзроўню Сусветнага акіяна, адзначаецца ў дакладзе міжурадавай групы экспертаў ААН па змяненні клімату. Пры гэтым спецыялісты мяркуюць, што праблем не ўдасца пазбегнуць нават у выпадку сур'ёзнага скарачэння выкіду парніковых газаў у атмасферу. У прыватнасці, трапічныя штормы калі і не будуць адбывацца рэгулярней, то ў любым выпадку стануць мацнейшыя, прагназуюць у міжнароднай арганізацыі. Згодна з дакладам, з 2005 года ўздым узроўню Сусветнага акіяна адбываецца ў 2,5 раза хутчэй, чым у XX стагоддзі, — у асноўным з прычыны раставання палярных ледніковў. У выпадку, калі выкіды парніковых газаў не стрымліваць, то ў 2100-м хуткасць гэтага працэсу можа ўзрасці ў чатыры разы, папярэджваюць аўтары даклада. Паводле ацэнак ААН, узвядзенне гідратэхнічных збудаванняў (накшталт дамбаў) на працягу наступных 80 гадоў дазволіць знізіць рызыку затапленняў. Але не паўсюль такія меры эфектыўныя.

# ЗАБЫТЫ КАШАЛЁК І СПРЭЧКА З ТАКСІСТАМ

## Карэспандэнт «Звязды» выйшаў на дзяжурства разам з патрульна-паставой службай

**Вечар пятніцы — незвычайны час. Заканчваецца чарговы працоўны тыдзень, і пэўная частка грамадства адзначае гэтую падзею пры дапамозе моцных напояў. У тым ліку — і ў кампаніі дома. Час ідзе, пачынаецца ноч. Слова за слова, і гутарка можа перацячы ў сварку. Добрасумленным суседзям, якія таксама стаміліся за пяць дзён, слухаць скандал у кватэры побач не вельмі падабаецца. І пасля на выклік прыязджае міліцыя, каб суцішыць буяноў.**

Такім здаваўся будучы рэйд увечары ў пятніцу па дарозе да Маскоўскага РУУС Мінска. На чарговую дванаццацігадзінную змену заступілі два дзяжурныя супрацоўнікі. Гэта **міліцыянер-кіроўца патрульна-паставой службы прапаршчык міліцыі Дзмітрый ЛЫСЮК і камандзір аддзялення роты патрульна-паставой службы міліцыі грамадскай бяспекі старшы прапаршчык міліцыі Сяргей ШАШКО.** Ім і належыць адпраўляцца па выкліках жыхароў Маскоўскага раёна ад сёмай вечара пятніцы да сёмай раніцы суботы.

— Чаго ў нас толькі не было! — згадваюць міліцыянеры. — І кацянят здымалі, і сабак адганялі. Пару разоў тэлефанавалі ў міліцыю са скаргай на... мух. Маўляў, яны гудуць і перашкаджаюць спаць. А аднойчы выклік ад 16-гадовай дзяўчыны завяршыўся прафілактычнай гутаркай з яе бацькамі. Мы адправіліся туды, думаючы, што там адбываецца вялікі скандал. Аказалася, што сястра выклікала міліцыю на малога брата з-за таго, што той... не хацеў аддаваць пульт ад тэлевізара. Давялося выклікаць на прафілактычную гутарку маці і тату, каб давесці ім, што малых трэба выхоўваць лепш.

**Падчас дванаццацігадзіннай змены ў патрульна-паставой службы рэдка бывае менш за дзесяць выклікаў. Але, як запэўніваюць міліцыянеры, нейкай градацыі па днях няма. Сказаць, што ўвечары ў пятніцу тэлефон 102 ледзь не пераграваецца, а ў суботу, напрыклад, амаль увесь час маўчыць, — нельга.**

### Гісторыя з хэпі-эндам

І вось мы кіруемся ў квартал «хрушчовак» паблізу станцыі метро «Грушаўка». Мужчына прыехаў туды на таксі і паведаміў, што згубіў кашалёк.

Відавочна, што міліцыянеры выдатна ведаюць свой раён. Дзмітрый Лысюк упэўнена вядзе службовы УАЗ па хітраспляценнях дваровых праездаў, не карыстаючыся ні картай, ні навігатарам. І вось, нарэшце, запаветная пяціпавярховая хрушчоўка. Але каля ўваходу нікто нас не чакае. На шчасце, чалавек, які тэлефанаваў, пакінуў свае кантакты.

— Такое нячаста, але здараецца, — кажа Сяргей Шашко. — Бывае, што чалавек прыехаў дадому з чыгуначнага вакзала або аэрапорта і схамянуўся, што недзе пакінуў свае чамаданы. А вось, дарэчы, у пятніцу ўвечары і ў суботу раніцай мы сутыкаліся з тым, што колькасць паведамленняў пра забытыя рэчы ўзрастае. Тут жа ўсё проста: пасядзелі ўвечары ў бары, пасля паехалі дадому на тралейбусе, забылі недзе сумку. Як выйшлі і як дайшлі дахаты — не памятаюць. Раніцай наступнага дня прачынаюцца — а рэчаў і няма.

Тым часам да нас з пад'езда выходзіць мужчына гадоў пяцідзесяці. Кажа, што менавіта ён і выклікаў міліцыю.

— Вы толькі да пад'езда даехалі? — пытаецца Сяргей Шашко.

— Так.

— А можа, недзе на дарозе згубілі? Тут жа цёмна...

— Ды абышоў усё з ліхтаром, няма. Прагледзеў усю лесвічную клетку — таксама нічога няма. Я ж на пяты паверх прыходзіў.

— А калі ўбачылі, што кашалёк прапаў?

— Ды як у кватэру зайшоў.

— А як вы разлічваліся з таксістам?

— Ну... дастаў кашалёк з задняй кішэні, аддаў грошы, пасля палажыў назад. Прамахнуўся, відаць. Але дзе кашалёк? Я тэлефанаваў дыспетчару, ён звязаўся з кіроўцам. Той кажа, што ніякага кашалька ў машыне не было.

— Давайце зробім так: зараз мы падымемся з вамі, прагледзім усю лесвічную клетку, — кажа Дзмітрый Лысюк. — Тут на праездзе мы кашалька не бачым, на ходніку таксама. Калі не знойдзецца — давядзецца ехаць разам з намі ў РУУС.



Кашалёк так і не знаходзіцца. Па дарозе да ўпраўлення міліцыянеры раяць небараку як мага хутчэй заблакаваць картку, якая была ў кашальку.

**...І якраз за некалькі хвілін да нашага прыезду ў дзяжурную частку РУУС прыйшоў 30-гадовы Аляксандр. З сабой ён прынёс кашалёк. Знайшоў ён яго акурат перад тым пад'ездам, куды прыязджаў на таксі наш папярэдні герой. Ён выходзіў з уласнага аўтамабіля і адчуў, што нешта трапіла пад нагу.**

Міліцыянеры тут жа апытваюць мужчыну, які згубіў кашалёк, пра яго колер і тое, што там было.

— Ну... там была картка зялёнага колеру, 50 долараў і 100 рублёў. А сам кашалёк цёмна-карычневы.

Месца і «характарыстыкі» знаходкі супадаюць цалкам. Пакінуўшы асабістыя звесткі, людзі разыходзяцца.

— Вы крыху спазніліся, — усміхаюцца ў дзяжурнай часці, даведаўшыся пра маю мэту візіту. — Тут у нас пару гадзін таму быў незвычайны выпадак. Дзве дзяўчыны, якія здымаюць кожная па пакоі, не падзялілі, каму належыць пакет са смеццем. Яны перастаўлялі пакет да дзвярэй візаві па чарзе. У рэшце рэшт яны пабіліся і... напісалі адна на адну заявы, паколькі маюць цялесныя пашкоджанні.

### Колькі каштуе таксі?

Другі выклік вымушае нас ехаць у самы цэнтр горада. Міліцыю выклікаў таксіст. Кажа, што пасажыр адмаўляецца плаціць па выстаўленым рахунку.

Прыехаўшы ў двор, мы бачым, як каля аднаго пад'езда стаяць чарнаскурыя мужчына і жанчына ва ўзросце за 50. З дапамогай электроннага перакладчыка яны тлумачаць, што прыляцелі з Лондана.

— Яны ўбачылі, што трансфер з Нацыянальнага аэрапорта ў Мінск каштуе 30 рублёў, — расказвае таксіст Уладзімір. — Але гэта справядліва для службы, якая працуе пры самім аэрапорце. Я ж — прыватнік. Я не буду даваць круг у сто кіламетраў з аэрапорта ў цэнтр Мінска за такія грошы. І запрасіў з іх 150 рублёў. Тым больш што я спадара загадзя папярэдзіў: кіламетр каштуе тры рублі. Усё па таксометры. У выніку мы тут гандлюемся ўжо больш за 40 хвілін. Англічанін сказаў — «трэба выклікаць паліцыю». Вось тут я з ім і пагадзіўся ўпершыню.

**Міліцыянеры пытаюцца: ці ўсё так? Замежнік пацвярджае. Але кажа, што справядлівая цана, на яго думку, — 50 рублёў. Таксіст тут жа зноў пачынае спрачацца. Маўляў, невялікі дыскont ён зрабіць можа, але канчатковы кошт 50 рублёў — гэта ўжо замала.**

— Праедзьце з намі ў аддзяленне, — кажа Сяргей Шашко. — Кожны з вас выкладзе пісьмова свае прэтэнзіі, і будзем пасля разбірацца, хто з вас правы, а хто не.

Англічанін крыху разважае, пасля выцягвае з кашалька яшчэ некалькі купюр і аддае таксісту. Кажа, што канфлікт уладжаны і нікуды ехаць не трэба. Такой жа думкі прытрымліваецца і таксіст.

Больш выклікаў у гэты вечар нам не дасталася. Нейкі ціхі выдаўся пятнічны вечар. Можа, яно і да лепшага...

Дзякуючы ўзніклай паўзе Сяргей Шашко і Дзмітрый Лысюк расказалі некалькі кур'ёзных гісторый, з якімі сутыкаліся падчас службы.

**Нядаўна іх выклікалі ў буцік аднаго з гандлёвых цэнтраў раёна. Два хлопцы хацелі скрасці футра. Калі прадавец убачыў, што маладыя людзі выходзяць не ў той вопратцы, у якой заходзілі, ён узняў трывогу. Пасля аказалася, што ў пакінутай у прымерачнай старой курткі засталіся пашпарт і мабільны тэлефон аднаго з іх.**

Узімку паступіў выклік, што на вуліцы Гурскага бегае... голы мужчына. У той час да нас завіталі маразы, і слупок тэрмометра знаходзіўся каля адзнакі ў 10 градусаў марозу. Прыязджаюць — так і ёсць, па вуліцы бегае чалавек у касцюме Адама. Ну што ж рабіць — пасадзілі яго ў машыну, ён крыху адагрэўся. Пасля пытаюць: што здарылася? Мужчына расказаў дзіўную гісторыю. Маўляў, яго запрасілі да сябе знаёмыя. Пілі, гулялі, пасля выйшлі на вуліцу пакурыць. Раптам адзін з іх нібыта сказаў: «Распранайся і бяжы». Што было далей — мужчына не памятаў. Затое згадаў нумар мабільнага тэлефона жонкі. Яна і прыехала пасярод ночы ў РУУС на таксі разам з сабраным наспех камплектам адзення.



А завершым наш аповед трагікамічным выпадкам. Неяк жыхары аднаго з дамоў набралі нумар 102 і паведамілі, што ў адной з кватэр адбываецца страшэнны скандал. Жанчына буяніць, лятае посуд. Дзверы ў кватэру зачынены не былі. Міліцыянеры зайшлі і ўбачылі, як жанчына стаіць у касцюме Евы і крычыць: «Вы мяне так проста не возьмеце!» Паспрабавалі ўзяць за руку — а жанчына выслізгвае, таму што намазалася крэмам. Давялося выклікаць брыгаду хуткай псіхіятрычнай дапамогі. Яна і звязала жанчыну пры дапамозе коўдры.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Тэма

# АПЕРАЦЫЯ «ПРЫХВАТЫЗАЦЫЯ»

## Што рабіць, калі вы знайшлі згубленую кімсьці рэч?

**Неяк давялося сутыкнуцца з дзіўнай сітуацыяй. У выхадны дзень трэба было тэрмінова зняць з карткі частку грошай. Побач з банкаматам не было нікога мінімум хвіліну. Але на экране прылады свяцілася не застаўка, а меню выбару аперацыі. Націснуў адмену — і тут жа са шчыліны рэзка выехала... чыясьці картка. Браць яе я не стаў. Праз секундаў дваццаць банкамат «праглынуў» чужы пластык назад. Але як па законе паступіць са знаходкамі? Пра гэта расказвае старшы інспектар па асаблівых даручэннях арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС падпалкоўнік міліцыі Аляксандр ЧАЛЕЙ.**



### Шэсць месяцаў вытрымкі

— Калі ў знойдзеным партманеце ёсць нейкія пластыкавыя карткі, візіткі, пропускі або іншыя прадметы, з дапамогай якіх можна ўстанавіць асобу ўладальніка, з ім трэба як мага хутчэй звязацца і ўсё вярнуць. Інакш гэта будзе лічыцца ўжо прысваеннем страчанай рэчы — фактычна вы завалодалі заведама чужой маёмасцю. Але наўрад ці хто з нас носіць у кашальку, напрыклад, паперку з нумарам свайго тэлефона. Таму неабходна неадкладна звярнуцца ў орган унутраных спраў або мясцовага кіравання і самакіравання па тым раёне, дзе вы знайшлі прадмет. Пры гэтым грамадзянін, які знайшоў рэч, мае права захоўваць яе ў сябе альбо здаць на часовае ўтрыманне ў органе, куды звярнуўся са знаходкай. Праўда, не назусім. Калі на працягу шасці месяцаў з моманту заявы аб знаходцы гаспадар не знойдзецца, то прадмет па законе будзе ўжо належаць вам.

**Колькасць людзей, якіх прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці за прысваенне чужых рэчаў, ідзе на спад. Калі ў 2015 годзе іх было 106, то ўжо летась — 63. А за восем месяцаў сёлета зарэгістравана ўсяго 37 такіх выпадкаў.**

Так, у Мінскай вобласці быў выпадак, калі чалавек пайшоў адпачываць на раку і знайшоў спінінг. Чалавек аказаўся сумленны. З адпачынку ён паехаў проста ў міліцыю, куды і здаў рыбалоўную прыладу. А крыху больш чым праз паўгода яму патэлефанавалі. Аказалася, што па спінінг ніхто не прыйшоў. Пасля складання адпаведных дакументаў вуду перадалі новаму ўладальніку.

Праўда, здараюцца выпадкі, калі ўладальнік дакладна ведае, дзе ён згубіў нейкую рэч. А калі вяртаецца — яе там ужо няма. У канцы мінулага года нехта з наведвальнікаў забыў кашалёк з грашыма ў адным з зоамагазінаў у сталіцы. Яго падабрала нейкая жанчына.

На знаходцы можна цалкам законна і зарабіць. Той, хто знайшоў чужую маёмасць і вярнуў яе ўладальніку, можа патрабаваць ад яго ўзнагароджанне. Але яно не можа перавышаць 20 % ад кошту знаходкі. Сума вызначаецца па пагадненні бакоў альбо праз суд. Тут трэба адзначыць, што права на ўзнагароджанне не ўзнікае, калі той, хто знайшоў чыюсьці рэч, не заявіў пра гэта або спрабаваў яе прыхаваць.

### Вы знайшлі грошы

Калі прыналежнасць кашалька можна ўстанавіць па яго вонкавых прыкметах або змесціве, дык з купюрай, якая ляжыць пасярод дарогі, сітуацыя ўжо куды больш складаная. Хто ж з нас перапісвае нумары ўсіх банкнот, якія праходзяць праз нашы рукі? І зусім іншая сітуацыя, калі чалавек бачыць, што грошы выпалі ў кагосьці, і прысвойвае іх.

Так здарылася ў канцы 2017 года ў адным з гандлёвых цэнтраў Мінска. У Першамайскае РУУС звярнуўся мужчына і паведаміў, што ў яго прапала 210 беларускіх рублёў і 80 долараў ЗША. Праваахоўнікі пачалі аналізаваць запісы з камер відэаназірання. І аказалася, што жанчына, якая ішла ззаду, падабрала некалькі купюр на агульную суму 20 долараў і 25 рублёў. Праўда, вярнаць грошы яна не стала і палічыла за лепшае іх патраціць. Пасля супраць жанчыны была заведзена крымінальная справа па частцы 1 артыкула 205 Крымінальнага кодэкса — «Крадзеж». Санкцыя яго прадугледжвае пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ, штрафу ці папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, або арышт ці абмежаванне волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленне волі на такі ж тэрмін. Вось такая цана за не самую вялікую прысвоеную суму.

### Як жа правільна дзейнічаць у такім выпадку?

Усе маніпуляцыі з чужымі грашыма — выдаткаванне, дарэнне, хаванне — раўназначныя прысваенню. І нават калі вы палажылі грошы ва ўласны кашалёк і не паспелі патраціць — лічыцца, што вы іх таксама прысвоілі, бо своечасова не заявілі пра знаходку ў органы ўнутраных спраў або мясцовага кіравання і самакіравання.

Адміністрацыйная або крымінальная адказнасць надыходзяць у залежнасці ад сумы. Па артыкуле 10.6 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях адказнасць не такая жорсткая — штраф да пяць базавых. Калі прысвоеная сума або грашовы эквівалент маёмасці мае асабліва буйны памер, які перавышае 1000 базавых велічынь, то ў ход уступае артыкул 215 Крымінальнага кодэкса. Ён прадугледжвае грамадскія работы, штраф або арышт на тэрмін да трох месяцаў.

Такія выпадкі ў нашай краіне нячастыя. Сёлета па гэтым артыкуле за першыя восем месяцаў не было заведзена ніводнай крымінальнай справы. А вось летась іх было цэлых дзве. У абодвух выпадках фігуравалі вельмі вялікія сумы, супастаўныя з коштам новага аўтамабіля ці нават аднапакаёвай кватэры ў Мінску, — 12,5 тысячы долараў і 94 тысячы рублёў адпаведна. А ў 2017 годзе хтосьці наогул прысвоіў вельмі дарагі гадзіннік, кошт якога вымяраецца дзясяткамі тысяч рублёў на цяперашнія грошы.

З кожным днём усё больш гандлёвых пунктаў, арганізацый і проста вулічнадарожнай сеткі трапляе пад прыцэлы аб'ектываў відэакамер. Таму выкрыць аматара чужога дабра — справа тэхнікі. Але тут ёсць адна асаблівасць. Уявім сабе сітуацыю: чалавек знайшоў чужую маёмасць, а пасля нейкім чынам страціў працаздольнасць, напрыклад, трапіўшы ў бальніцу. За час, пакуль ён будзе знаходзіцца там, яго асобу паспелі высветліць па запісах відэакамер, але ж магчымасці вярнуць грошы ён фізічна не меў. У такім разе пачнецца высвятленне ўсіх абставін, і калі яны пацвердзяцца цалкам, то чалавека вызваляць ад адказнасці.

А вось знойдзены ў адміністрацыйных будынках, гасцініцах, магазінах і г. д. і пакінуты сабе тэлефон або іншая рэч — гэта ўжо ў большасці выпадкаў крадзеж. У гэтым разе лічыцца, што ўладальнік ведае, дзе знаходзіцца яго маёмасць, а той, хто знайшоў, — ведае альбо здагадваецца, што ўладальнік можа па гэту маёмасць вярнуцца.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### Трэба ведаць

**Калі вы знайшлі згубленую рэч у рэстаране, краме, установе адукацыі, то незалежна ад таго, вядомы законны ўладальнік знаходкі або не, трэба паведаміць пра яе ў адміністрацыю аб'екта, дзе вы знаходзіцеся. У грамадскім транспарце сітуацыя іншая, бо прадстаўнікамі парка там з'яўляюцца кіроўца або машыніст і кандуктар (пры яго наяўнасці, канешне). Браць знаходку ў рукі — гэта ўжо рызыкоўна. Яе знешні выгляд можа хаваць сапраўднае прызначэнне рэчы. У свеце не аднойчы здаралася так, што пад выглядам бяскрыўднай каробкі або цацкі хавалася выбуховая прылада. Таму пазначце сабе час, калі вы знайшлі згублены прадмет, пастарайцеся, каб людзі адышлі далей ад падазронага аб'екта, і дачакайцеся прыбыцця следча-аператыўнай групы. Для яе супрацоўнікаў вы з'яўляецеся важным відавочцам.**



Падзея

## Разам да перамогі

**Пад такой назвай Міністэрства ўнутраных спраў арганізавала турнір па міні-футболе сярод падлеткаў.**



Праходзіў ён тры дні на базе спартыўна-аздараўленчага лагера «Зялёны бор», што месціцца ў пасёлку Зялёнае Мінскага раёна. Склад гульцоў быў незвычайны: з дзевяці ўдзельнікаў кожнай каманды — сямёра падлеткаў і юнакоў, прычым гэта маладыя людзі, датычна якіх інспекцыі па справах непаўналетніх вядуць індывідуальную прафілактычную работу. Таксама ў камандах было па два міліцыянеры. Асобную дружыну на спаборніцтвы вылучыў спецыялізаваны ліцэй МУС.

Перамогу атрымалі сталічныя футбалісты, якія ў вырашальным матчы адзначыліся двума галамі ў вароты гасцей з горада над Бугам, што сталі сярэбранымі прызёрамі. Трэцяе месца — у прадстаўнікоў Віцебшчыны. Узнагароды камандам-трыумфатарам уручыў намеснік міністра ўнутраных спраў Мікалай Мельчанка. Ён зазначыў, што такія турніры дазваляюць умацаваць пачуццё таварыскасці.

Ва ўрачыстай цырымоніі таксама ўдзельнічалі славуты беларускі футбаліст Аляксандр Глеб і прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у нашай краіне Рашэд Мустафа Сарвар.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота МУС.**

Учынак

## Міліцыянер выцягнуў дзяўчынку з ямы

**Гісторыя адбылася ў Пінску. Дзяўчынка выйшла на вуліцу разам з сабакам. Яна ішла да пляцоўкі, дзе звычайна выгульвала свайго чатырохлапага сябра, але... у цемры не заўважыла яму глыбінёй больш за тры метры. Яе выкапалі для дрэнажнай сістэмы. Дзяўчынка правалілася ў тую яму разам са сваім сабакам.**

Праз некаторы час дадому са службы вяртаўся камандзір узвода роты міліцыі Пінскага аддзела Дэпартамента аховы капітан міліцыі Аляксандр Швец. Ён пачуў крыкі аб дапамозе, якія несліся аднекуль з-пад зямлі. Міліцыянер пайшоў на гук — і так знайшоў дзяўчынку разам з сабакам. Ён спусціўся ўніз і дапамог дзяўчынцы вылезці наверх. А вось сабака моцна спалохаўся і чужынцу ў рукі не даваўся. Таму дзяўчынка пабегла дадому клікаць бацьку па дапамогу, а афіцэр застаўся разам з сабакам чакаць, пакуль яны вернуцца.

Бацькі дзяўчынкі пасля прыйшлі ў аддзел Дэпартамента аховы і шчыра падзякавалі за дапамогу і неабыякавасць да тых, хто трапіў у бяду.

Да ведама

## Тэхнічная прафілактыка

**Міністэрства ўнутраных спраў паведаміла, што ад сёмай гадзіны раніцы 29 верасня да дзявятай раніцы 30 верасня будзе адключана сервернае абсталяванне ведамства з-за тэхнічных работ.**

З гэтай прычыны будуць недаступны два сервісы — аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «Гасцініцы» і электронная паслуга на адзіным партале электронных паслуг «3.29.01 Перадача інфармацыі аб замежных грамадзянах і асобах без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь».

Інфармацыя аб замежных грамадзянах і асобах без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, прадстаўляецца ў органы ўнутраных спраў у адпаведнасці з пастановай Міністэрства ўнутраных спраў ад 1 ліпеня 2010 года № 214.

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Яловица и дер. Жажелка Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
|---|---|---|
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **29 октября 2019 года, в 10.00,** г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881715101000118 в дер. Яловица<br>**Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881705601000157 в дер. Жажелка |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная цена продажи | **Лот № 1** – 10 000,00 рублей<br>**Лот № 2** – 5 000,00 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | А) продажа по цене, не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории страны или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь<br>В) наличие не менее двух участников<br>Г) без права предоставления рассрочки |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 (возможность подключения газоснабжения и электроснабжения) |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ № 616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25А, БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11. | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Начало подачи заявлений | **с 30 сентября 2019** года с 8.00 до 17.00, каб. № 3 |
| 13 | Окончательный срок приема заявлений | **25 октября 2019 года до 17.00** |
| 14 | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | Внесения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся платы за земельный участок и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и внесения платы за земельный участок;<br>осуществление победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона государственной регистрации создания земельного участка и прав на него в Смолевичском бюро Борисовского филиала РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;<br>занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и права на него |
| 15 | Контактные телефоны | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: Лот № 1 – 1 999,71 рубля; Лот № 2 — 1 602,12 рубля (затраты без учета стоимости информационного сообщения).**

**Затраты на строительство, в том числе на проектирование объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

Примечания: для участия в аукционе на адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
|---|---|
| Продавец | Червенское райпо, Минская обл., г. Червень, ул. Ленинская, 32 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Склад для хранения тары** | Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 1299,5 кв. м | 615/С-39498 | Минская обл., Червенский район, г. **Червень**, улица Ленинская, д. 32Б |

Составные части и принадлежности: навес

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,3383** га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания материально-технической базы

**Начальная цена с НДС 20 % – 82 799,47 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| Срок подписания договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
|---|---|

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 22.08.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 10.10.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 09.10.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества ОАО «МПЗ» (Продавец)

**Лот № 1:** 1. Здание службы механика, инв. № 500/С-55970, 1999 г. п. Площадь 17,7 м². Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/ 15. 2. Здание специализированное обрабатывающей промышленности инв. № 500/С-39621, 1992 г. п. Площадь 350,9 м². Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/11. **Начальная цена** с НДС – 179 817,93 бел. руб. **Задаток –** 20 000,00 бел. руб. Земельный участок: кадастровый номер 500000000002002072, площадь 1,1882 га. Право временного пользования (по 31.05.2025). На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Лот № 2:** Незавершенное законсервированное строение, инв. № 500/U-1026105. Площадь 857,6 м². Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/7. **Начальная цена** с НДС – 1 368 132,12 бел. руб. **Задаток** – 100 000,00 бел. руб. Земельный участок: кадастровый номер 500000000002008444, площадь 36,8556 га. Право общей долевой аренды (по 31.07.2053). Доля: 99/100. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by

**Аукцион состоится 10.10.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 10.10.2019 (ОАО «МПЗ», Лота №__). Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений — 08.10.2019 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.06.2019

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
25 сентября 2019 г.
Лихачевский В. В.

УТВЕРЖДЕНО
Решение Общего собрания участников Иностранного общества с ограниченной ответственностью «ДАНА АСТРА»
от 16 сентября 2019 г. № 16-09/2019

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА ИНОСТРАННОГО ОБЩЕСТВА С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «ДАНА АСТРА»

1. Пункт 1.2 раздела 1 Проспекта эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска ИООО «ДАНА АСТРА» изложить в следующей редакции:
«1.2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес, сайт
Место нахождения: Республика Беларусь, 220114, г. Минск, ул. Петра Мстиславца, д. 9, помещение 3, кабинет 4;
почтовый адрес: 220039, г. Минск, ул. Чкалова, д. 38, корп. 1;
номер телефона: 8 (017) 2693260, номер факса: 8 (017) 2693250;
электронный адрес (e-mail): info@dana-holdings.com;
официальный сайт: www.minskworld.com (далее – сайт Эмитента).»

2. Пункт 1.12 раздела 1 Проспекта эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска ИООО «ДАНА АСТРА» изложить в следующей редакции:
«1.12. Сведения об исполнительном органе Эмитента
Директор Эмитента: Овчаров Павел Григорьевич. Год рождения – 1976. Образование – высшее (Белорусский государственный экономический университет, 2000). Идентификационный номер – 3030776A077PB6.
Занимаемые должности за последние 3 года и в настоящее время: 08.08.2016 – 24.11.2016 – заместитель директора ООО «РуБелЭко»; 12.01.2017 – 10.05.2017 – заместитель директора ООО «ЛаВита-центр»; 18.04.2018 – 20.12.2018 – заместитель директора по стратегическим и финансовым вопросам Эмитента; с 21.12.2018 по настоящее время – директор Эмитента. Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.
Главный бухгалтер: Ефимова Римма Казимировна. Год рождения – 1964. Идентификационный номер – 4121264E003PB3.
Занимаемые должности за последние 3 года и в настоящее время: 04.12.2014 – 19.08.2018 – заместитель главного бухгалтера Эмитента; с 20.08.2018 по настоящее время – главный бухгалтер Эмитента. Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.»

3.Остальные пункты Проспекта эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска ИООО «ДАНА АСТРА» остаются без изменений.

И. о. директора Иностранного общества с ограниченной ответственностью «ДАНА АСТРА» Вибор Мулич

Главный бухгалтер Иностранного общества с ограниченной ответственностью «ДАНА АСТРА» Р. К. Ефимова

УНП 100122726

23.09.2019 осуществлена реорганизация Закрытого акционерного общества «Инicio» (г. Минск, ул. Орловская, 58, пом. 7, оф. 325) в форме присоединения (протокол общего собрания акционеров от 12.09.2019). Депозитарий: Общество с ограниченной ответственностью «Каскад-93-Инвест», 220007, г. Минск, ул. Володько, 6, к. 18, УНП 100992061.

В связи с утерей считать недействительными бланки квитанций о приеме наличных денежных средств серии ВА 8644809-8648410 филиала «Белкоопстрах», ВА 8728883-8728884, ВА 8728899-8728900 филиала «Промтрансинвест», ВА 1485805-1485814 филиала «Белэксимгарант».

Утерянное свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя на имя Загорской Оксаны Геннадьевны, УНП 690511071, считать недействительным.

- в связи с утерей считать недействительными страховые свидетельства филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 1038454—1038460 (7 шт.);

- в связи с утерей считать недействительным страховое свидетельство филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске страховой полис бланк квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии СВ № 6108242;

- в связи с утерей считать недействительными страховые свидетельства филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске страховой полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 1163579—1163580 (2 шт.).

УНП 100706519

Квитанции о приеме наличных денежных средств серии СВ № 0642083—0642086, № 4418121—4418146, № 4447939—4447949 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

УНП 100357923

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**_6 ноября 2019 года в 11.00_ в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков**

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций, условия предоставления | Начальная цена предмета аукциона*, бел. руб. | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона, и дополнительно расходы, связанные с публикацией объявления, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Земельные участки, предоставляемые **в частную собственность для коллективного садоводства** (земельные участки для коллективного садоводства), Гомельская область, Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна». Имеется возможность подключения электроснабжения. | | | | |
| 1 | Участок № 35А к/н 321084800019000098, площадь 0,1246 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,1246 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов); 0,0121 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей) | 7 999,32 | 917,27 | 800,00 |
| 2 | Участок № 49 к/н 321084800019000094, площадь 0,1132 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,1132 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов); 0,0048 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей) | 7 267,44 | 1082,58 | 727,00 |
| 3 | Участок № 70 к/н 321084800019000093, площадь 0,1051 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: на площади 0,1051 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов) | 6 747,42 | 1077,05 | 675,00 |
| 4 | Участок № 69 к/н 321084800019000097, площадь 0,1045 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: на площади 0,1045 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов) | 6 708,90 | 1008,13 | 671,00 |
| 5 | Участок № 91 к/н 321084800019000095, площадь 0,0899 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,0899 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов); 0,0030 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей) | 5 771,58 | 1029,32 | 578,00 |
| 6 | Участок № 55 к/н 321084800019000096, площадь 0,0896 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,0896 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов); 0,0043 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей) | 5 752,32 | 962,90 | 576,00 |

Организация, предоставляющая информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду, частную собственность по результатам аукциона: Управление землеустройства Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 123, телефон для справок 8 0232 53 15 21.

Условия предоставления земельных участков: в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления, по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Задаток вносится на р/с: Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY21302 УНП 400178549. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123 тел. 53 15 21. Дата и время начала и окончания приема заявлений — **01.10.2019 по 04.11.2019 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00**.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы. Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков.

Рассрочка может предоставляться по решению райисполкома в случае, если размер платы превышает:
700 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей;
1500 базовых величин для юридических лиц.

Ознакомиться с земельным участком возможно при предварительном согласовании с управлением землеустройства Гомельского райисполкома, позвонив по телефону 53 15 21.

# ДЫЕТА НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ



## Можна толькі ваду, цукар і алей

— Фенілкетанурыя — генетычнае захворванне бялковага абмену. У такіх, як я, кіслата фенілаланін не перапрацоўваецца ў тыразін і становіцца атрутай, з-за гэтага 90 % звыклых прадуктаў выключаецца з рацыёну, — тлумачыць Дзмітрый. — Вада, цукар і алей — гэта тры рэчы, якія мне можна, — так сказалі маёй маме, калі выявілі гэта захворванне.

У Беларусі каля 700 чалавек хворыя на фенілкетанурыю. Гэта хвароба выяўляецца яшчэ ў раддоме, і дзіця атрымлівае інваліднасць. З гэтага часу спачатку бацькі, а потым і сам пацыент мусяць жыць, падлічваючы ўжыты бялок. У кожнага захворванне праяўляецца ў рознай ступені. Хтосьці можа з'есці і паўкіло бульбы, Дзмітрыю можна не больш за адну бульбіну ў суткі.

— Двух аднолькавых людзей з гэтым захворваннем не бывае: ва ўсіх розная талерантнасць. У мяне класічная фенілкетанурыя, і мне можна ўсяго шэсць-сем грамаў натуральнага бялку ў дзень. Дрэнна і тады, калі гэтага бялку не стае арганізму.

Дыета людзей, хворых на фенілкетанурыю, непадобная нават да вегетарыянскай ці веганскай. Тут пад забаронай літаральна ўсё, нават тыя ж арэхі. Хворыя на фенілкетанурыю са звыклых астатнім прадуктаў ужываюць толькі фрукты і агародніну, прычым у абмежаванай колькасці, а таксама напоі. Можна дадаваць у рацыён нізкабялковую ежу — макарону, хлеб, печыва, якія выпякаюцца са спецыяльнай мукі. А вось пра такія прадукты, як мяса, катлеты ці каўбасы або тварог, не можа ісці і размовы — Дзмітрый не ведае нават, якія яны на смак. Запоўніць дэфіцыт бялку, мікраэлементаў і вітамінаў могуць толькі спецыяльныя амінакіслотныя сумесі.

— Мне з класічнай фенілкетанурыяй гэта сумесь жыццёва неабходная. Я не магу нармальна харчавацца, і яна наталяе голад і забяспечвае патрэбу ва ўсім тым, што я не магу атрымаць з ежай. Я павінен яе прымаць чатыры разы на дзень. Кожны дзень нашу з сабой порцыю гародніны, а таксама шэйкер — на перапынку паміж парамі ў каледжы раблю сумесь. Заняткі доўжацца да чатырох-пяці гадзін, і такім чынам я харчуюся ў сярэдзіне дня.

Да 18 гадоў Дзмітрый атрымліваў сумесі бясплатна. Прычым пераход з адной сумесі на другую часта адбываецца дастаткова хваравіта.

— Нам закуплялі і выдавалі той прэпарат, які выйграе тэндар. Я памятаю галодныя часы ў дзяцінстве, калі выйграла тэндар адна расійская сумесь. Пачалася моцная алергія — мой арганізм яе папросту не прымаў. Доўга з мамай ляжаў у бальніцы, — успамінае малады чалавек. — Нарэшце гэты тэндар скончыўся і паставілі іншую сумесь, якая была раней.

## У месяц — 1200 рублёў на сумесь

У жніўні, пасля таго як Дзмітрыю Жызнеўскаму споўнілася 18, ён пазбавіўся інваліднасці і магчымасці бясплатна атрымліваць сумесь.

— Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе, дзе хворыя на фенілкетанурыю атрымліваюць спецыялізаванае лячэбнае харчаванне толькі да 18 гадоў. Усюды, у тым ліку і ва ўсіх краінах СНД, яго выдаюць пажыццёва. Прычым калі ў Расіі і Украіне бясплатная толькі сумесь, то ў Еўропе пайшлі яшчэ далей: штомесяц бясплатна выдаюць мінімальны кошык нізкабялковых прадуктаў — хлеб, макарону, муку, печыва.

Нізкабялковыя прадукты ў Беларусі нятанныя. Пачак макароны, напрыклад, каштуе ў Мінску больш за дзесяць рублёў, столькі ж 300-грамовы хлеб. У Польшчы, дзе Дзмітрый імкнецца іх пры магчымасці закупіць, значна танней — каля 4 рублёў. Малады чалавек спадзяецца, што калі-небудзь гэтыя прадукты стануць больш даступнымі і ў нас іх пачнуць прадаваць без нацэнкі. Але калі набыць нізкабялковыя прадукты яшчэ магчыма, то амінакіслотныя сумесі каштуюць вельмі дорага — каля 1200 рублёў на месяц.

— У «Белфармацыі» адна бляшанка каштуе 150—160 рублёў. На месяц мне такіх патрэбна сем-восем. Адзінае, што мне прапанавалі ў Міністэрстве аховы здароўя, калі я туды звярнуўся, — зрабіць продаж сумесяў па закупачнай цане, без надбавак. Але з улікам гэтага ўсё роўна бляшанка будзе каштаваць 120—130 рублёў.

Зразумела, што такая цана непад'ёмная нават для многіх з тых, хто працуе, не кажучы пра студэнта Дзмітрыя. Яго сябры з суседніх краін, якія добра ведаюць сітуацыю з хворымі на фенілкетанурыю ў нас, пакуль дзеляцца з хлопцам сумессю. Дзмітрый жа дабіваецца, каб і ў Беларусі пацыенты маглі атрымліваць яе бясплатна.

— Я знаходжуся ў групах усіх замежных таварыстваў па фенілкетанурыі, і ў мяне ёсць сябры і знаёмыя, такія ж пацыенты з іншых краін. Даводзіцца іх прасіць — перашлі бляшаначку. Зразумела, няёмка ўвесь час выпрошваць. Ды і не факт, што дадуць якасны прадукт, звычайна гэта пратэрміноўка. Таму пасля 18 гадоў усяго каля 20 % хворых працягвае прытрымлівацца дыеты. Для большасці гэта немагчыма, бо калі чалавек жыве ў вёсцы, адкуль у яго грошы на сумесі? Нават нізкабялковае харчаванне — хлеб, макарона і мука — гэта праблема. Ёсць страшныя сюжэты, калі людзі не прытрымліваліся дыеты. Напрыклад, скура прыходзіць у жудасны стан, з'яўляюцца пролежні, пры змазванні прэпаратамі ўчасткі скуры знімаюцца разам з маззю.

Калі дыеты не прытрымлівацца, то наступствы будуць непапраўныя, але ў аддаленай перспектыве. У гэтым усё каварства фенілкетанурыі.

— У мяне часта пытаюць: а што з табой стане, калі ты будзеш есці штосьці недазволенае? — працягвае Дзмітрый. — Амінакіслата трапляе ў кроў і атручвае яе таксічнымі рэчывамі. Пакутуюць элементы крыві — фактары падтрымкі імунітэту. А таксама органы выдзялення — страўнікава-кішачны тракт, скура, лёгкія, якія паражаюцца. Амінакіслата можа назапашвацца ў арганізме нейкі перыяд, а ў пэўны час рэзка пачне пагаршацца стан гэтых органаў.

## Атрымаць доступ да харчавання і лячэння

Хворыя на фенілкетанурыю стаяць на ўліку ва ўрача-генетыка. І маюць патрэбу ў кансультацыях такога спецыяліста, як дыетолаг.

— З маім захворваннем дыетолаг з'яўляецца важным звяном. Ён павінен дапамагчы правільна разлічваць норму бялкоў-тлушчаў-вугляводаў, мікраэлементаў, складаць дыету. Але дыетолага ў нас няма, — тлумачыць Дзмітрый. — Генетыкі працуюць па старых нормах. Няма ніякай інфармацыі па новых метадах лячэння майго захворвання, не праводзяцца канферэнцыі. Урач, напрыклад, напісала мне, што дазволеная колькасць меланінаў у крыві не павінна перавышаць 20. Я здзівіўся гэтай лічбе, бо ва ўсім цывілізаваным свеце яго трымаюць на ўзроўні не вышэй за 6. Таму важна інфармаваць урачоў-генетыкаў аб нашай праблеме.

Дзмітрый Жызнеўскі актыўна ўдзельнічае ў пацыенцкіх форумах міжнародных канферэнцый па фенілкетанурыі. Ён не толькі не хавае факту сваёй хваробы, але і не разумее, чаму яго хаваюць іншыя.

— З адным са сваіх праектаў я выступаў на конкурсе стартапаў. Мяне папрасілі знайсці пару чалавек для інтэрв'ю. Адна мая сяброўка сказала: я не хачу, каб даведаўся мой хлопец, другая — я баюся журналістаў і не буду з імі размаўляць... Мне здаецца, у XXI стагоддзі нікога не здзівіш, што нешта ты не ясі.



— Навакольныя рэагуюць абсалютна нармальна: захворванне і захворванне, як быццам бы вегетарыянец, — далучаецца да размовы сяброўка і аднакурсніца Дзмітрыя Настасся. — Але вось калі мы выходзім у горад пагуляць ці з'есці нешта, у многіх кафэ для Дзімы няма нічога, акрамя кавы, часам з усіх страў падыходзіць адна салата.

— У той жа Польшчы з лёгкасцю можна знайсці кафэ, дзе прадаецца безглютэнавая і безбялковая выпечка. У нас хворым на фенілкетанурыю паесці ў грамадскіх месцах немагчыма, — дадае Дзмітрый.

Пры гэтым атрымліваць асалоду ад ежы хворым на фенілкетанурыю ўсё ж можна, упэўнены суразмоўнік. Нізкабялковы хлеб для хворых мінчан выпякае шэф-повар аднаго з рэстаранаў Аляксандр Чыкілеўскі. У яго цэлая лінейка на розны густ — з маслінамі, перцам, карыяндрам. Ды і звычайны кабачок можна проста пасмажыць на рашотцы, а можна ўкачаць у муку, дадаць часнаку і пасмажыць на патэльні.

Найбліжэйшая мэта Дзмітрыя — паехаць на міжнародную канферэнцыю па фенілкетанурыі, якая будзе праходзіць у Турцыі. Там раскажуць пра найноўшыя метады лячэння гэтай хваробы, выступяць дыетолагі, прадставяць новыя лінейкі прадуктаў, адбудзецца форум пацыентаў.

— Гэта вялікая магчымасць пакантактаваць з пацыентамі з іншых краін, пераняць іх вопыт, і канешне, паразмаўляць з медыкамі, дыетолагамі, якія могуць даць рэкамендацыі, пратаколы лячэння, каб падзяліцца новай інфармацыяй з нашымі спецыялістамі. Ва ўсім свеце даказана неабходнасць пажыццёвай дыеты. У нас хворыя пасля 18 гадоў пазбаўлены медыцынскай падтрымкі. З-за высокага кошту лячэбнага харчавання хворыя фактычна пазбаўлены права на здаровае жыццё. І цяпер мая задача — дасягнуць таго, каб пацыенты мелі доступ да прадуктаў і метадаў лячэння.

Дапамагчы Дзмітрыю ў зборы сродкаў для паездкі на міжнародную канферэнцыю можна тут: https://molamola.by.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Кампетэнтна

**Ірына НАВУМЧЫК, намеснік дырэктара па медыцынскай генетыцы РНПЦ «Маці і дзіця»:**

— Для фенілкетанурыі характэрны павышаны ўзровень фенілаланіну, калі хворы не прытрымліваецца дыеты. І гэта тоіць небяспеку перш за ўсё для нервовай сістэмы пацыента. Найбольш уплыў высокі ўзровень фенілаланіну робіць у раннім дзяцінстве. Калі дзіця не прытрымліваецца дыеты, гэта можа скончыцца разумовай адсталасцю рознай ступені цяжкасці. Таму для дыягностыкі гэтай хваробы ў нас выкарыстоўваецца масавы скрынінг усіх нованароджаных, які дзейнічае з 1978 года. За гэты час мы атрымалі даволі працяглы вопыт назірання нашых пацыентаў розных узростаў, якія ў рознай ступені прытрымліваліся дыеты. Ёсць тыя, хто з дзяцінства не рабіў строгіх абмежаванняў у харчаванні і пры гэтым не мае разумовай адсталасці, гэта нармальныя сацыяльна адаптаваныя людзі. У кагосьці захворванне больш выражана. Але самы важны этап — ранняе развіццё.

У свеце былі розныя спробы выкарыстоўвання дыеты і лячэбнага харчавання пры фенілкетанурыі: да 5-6 гадоў, потым да 12. Сёння лічыцца мэтазгодным падтрымліваць яе на працягу ўсяго жыцця. Але, як паказвае вопыт іншых краін, дзе хворыя атрымліваюць лячэбнае харчаванне па медыцынскай страхоўцы бясплатна, чым старэйшы становіцца пацыент, тым менш ён гатовы «сядзець» на дыеце. Да 70 % хворых яе не прытрымліваюцца. Пераносяць яны гэта па-рознаму, як правіла, вельмі цяжкіх наступстваў няма.

Улічваючы, што самы важны этап для хворых на фенілкетанурыю — перыяд ранняга развіцця, у нас бясплатнае лячэбнае харчаванне атрымліваюць дзеці да 18 гадоў, а таксама цяжарныя жанчыны. Дарослым, калі яны не выкарыстоўваюць сумесь, мы таксама рэкамендуем абмяжоўваць жывёльныя бялкі. Аднак паўнацэннай дыета з абмежаваннем бялку для такіх хворых можа быць толькі пры выкарыстанні амінакіслотных сумесяў, якія дазваляюць пазбегнуць бялковага дэфіцыту. Таму цяпер абмяркоўваецца пытанне павелічэння ўзросту, у якім пацыенты будуць атрымліваць сумесь бясплатна.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 36 (478)



Падзея месяца

# Аднолькава добры альбо аднолькава дрэнны свет

## Наколькі арганічна філасофія Вальтэра глядзіцца ў лялечным тэатры



Фота Яўгеніі ВАЙЦЕХОВІЧ.

**Гэта ўсё. Адзін з найлепшых беларускіх рэжысёраў-лялечнікаў Ігар Казакоў, які зрабіў славу Магілёўскаму тэатру лялек і толькі-толькі з яго сышоў, паказаў у Мінску сваю пастаноўку «Кандзід, альбо Аптымізм». Паказ адбыўся ў рамках форума тэатральнага мастацтва «Тэарт» і прадэманстраваў, як шалёна недарэмна ў сталіцы збіраецца праграма «Belarus Open». Пікантная філасофская аповесць Вальтэра ў свой час хваляй пракацілася па Еўропе, а сёння, калі ўразіць сытага гледача ўжо складаней, Казакоў бярэ надзвычайнай выкрутлівасцю ў ператварэнні маленькай тэатральнай сцэны ў агромісты няветлівы свет, дзе нацягваць на сябе ўсмешку застаецца толькі штучна, рукою. Такі ёмкі, вынаходлівы, іранічны Вальтэр нам бясспрэчна даспадобы.**

Лялечныя спектаклі як неад'емны авангардны элемент беларускага тэатра ў праграму форуму ўваходзяць заўсёды, ды і сам Ігар Казакоў — даўно не навічок як на «Тэарце», так і ў пахвальных водгуках крытыкаў. Глядач, магчыма, памятае яго пастаноўкі «Гамлет», «На дне» і «Сіняя-сіняя» і разумее масштаб страты Магілёўскага тэатра лялек, з якога рэжысёр сышоў пасля трынаццаці гадоў работы, бо менавіта дзякуючы Казакову на гэтым абласным горадзе быў пастаўлены адзін з дэцэнтрычных акцэнтаў тэатральнай сферы.

Зрэшты, сыходы апошнім часам наогул характэрныя для нашай сцэны. Мы ўжо расказвалі пра рэжысёра Аляксандра Янушкевіча, што звольніўся з Брэсцкага тэатра лялек і гэтым таксама яго аслабіў. А інсцэніроўку спектакля «Кандзід, альбо Аптымізм» напісаў адзін з найцікавейшых айчынных драматургаў і рэжысёр Дзмітрый Багаслаўскі, які не так даўно сышоў з Маладзёжнага тэатра.

Нягоды галоўнага героя пастаноўкі з нягодамі беларускіх тэатралаў у нечым ненаўмысна перагукаюцца. Яшчэ неспрактыкаванага юнака Кандзіда, які выхоўваўся ў замку барона і жалезна верыў у перакананне настаўніка Пангласа ў тым, што ўсё ідзе да лепшага, выкурылі з замка за інтымную сувязь з дачкой уладара Кунігундай — і пачалося. Кандзід стаў блукаць у пошуках прыкметаў таго самага найлепшага свету, у існаванне якога верыў дзякуючы Пангласу, але трапляў на новыя і новыя выпрабаванні ды ім усё не было канца.

Армія, інквізіцыя, прыродныя катаклізмы, гандаль людзьмі, выкарыстанне сваёй улады, барацьба паміж рэлігіямі, прадажны суд, забойствы, падманы, рабаванні і нізкая чалавечая існасць — праз усё гэта праходзяць аптымізм, даверлівасць і каханне Кандзіда, каб у рэшце рэшт прымусіць нацягнуць змушаную ўсмешку і спыніцца на думцы, што паўсюль у свеце аднолькава дрэнна.

Чым далей, тым больш бляклым становіцца настрой галоўнага героя, і пастановачная група выкарыстала надзейныя спосабы гэта адлюстраваць. Апроч таго, што выканальнік галоўнай ролі Аляксандр Куляшоў паступова пазбаўляецца адзення (і суд сімвалічна раздзявае яго ўканец), ён з усё глыбейшым сумам, з усё цішэйшым голасам, з усё больш павольнымі рухамі садзіцца за вясло, каб адправіцца ў чарговае падарожжа ў пошуках лепшага жыцця. Аптымізм, выдатна вымаляваны Аляксандрам Куляшовым (субтыльны хлопец у нязграбным галаўным уборы жвава рухаецца і ўсё задаецца пытаннямі аб светабудове) у спектаклі, здаецца, мяжуе з неразумнасцю. Зрэшты, панаваць яму застаецца нядоўга.

Функцыянальныя дэкарацыі раз-пораз ператвараюцца ў судна і без асаблівых высілкаў пераносяць месца дзеяння ў іншыя гарады ды краіны. У праёмах з'яўляюцца новыя персанажы, выявы і рэквізіт, і судна лёгка робіцца зямной лакацыяй. Тэатральная сцэна без разбуральных умяшанняў умомант перайначваецца ў Буэнас-Айрэс, Венецыю альбо казачную зямлю Эльдарада, і вынаходлівым выкарыстаннем месца ўсё не абмяжоўваецца. Вобразы і эпізоды сумяшчаюць у сабе прыемную воку эстэтыку, метафарычнасць ды здаровы кураж аўтараў, дзе і гумар, і сумная іронія, і прамыя адсылкі да рэчаіснасці.

Хоць дзеянне і адбываецца дзе заўгодна, але не ў Беларусі, інсцэніроўка і рэжысёрскія рашэнні спектакля ўвесь час нагадваюць, што знаходзіцца за дзвярыма тэатра. Першакрыніца не проста аказваецца надзённай дзякуючы сваёй крытыцы марнага аптымізму — яна яшчэ і ўвасабляецца са шматзначнымі, датычнымі ўжо толькі нас, дэталямі. Аўтары ўдала расставілі акцэнты па працяглых падарожжах Кандзіда і на некаторых яго «пунктах» спыніліся асобна — так філасофская аповесць XVIII стагоддзя з прыгожым гумарам і надрыўнай журбой стала беларускім спектаклем.

Ты з задавальненнем дзеліш гэтыя жарты, намагаешся ахапіць сцэну ў яе — кожную секунду — прыцягальнай кампазіцыі, як дурань чакаеш чарговай пстрычкі па аптымізме Кандзіда, бо ён задаволіць тваё чаканні і пакажа больш рэжысёрскіх вынаходак, але нарэшце спектакль канчаецца. І ты ўсё разумееш.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**


Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

## Аляксандр АНІСІМАЎ:

# «ДОБРА БЫЛО Б МЕЦЬ РАЎНАВАГУ ПАМІЖ СПОРТАМ І МУЗЫЧНЫМ МАСТАЦТВАМ»

**Дырыжор, прафесійная карта якога шырыцца ледзь не на ўвесь свет, адкрыў чарговы сімфанічны сезон мінскай філармоніі. На сваім першым восеньскім канцэрце Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам маэстра сыграў Шастаковіча, Моцарта і беларускага кампазітара Вольгу Падгайскую. Шаснаццаць гадоў у філармоніі і амаль сорак у Беларусі: некалі масквіч Аляксандр Анісімаў атрымаў запрашэнне стаць галоўным дырыжорам Вялікага тэатра ў Мінску, а ўжо сёння называе Беларусь радзімай і без лішняй сціпласці прызнаецца, што ў Мінску хадзіць у філармонію стала модна. Гэтым разам свае пытанні пра сферу сучаснай акадэмічнай музыкі мы задаём самаму вядомаму беларускаму дырыжору.**

**— Не так даўно на кінастудыі «Беларусьфільм» пра вас вышаў дакументальны фільм Міхаіла Ждановўскага. Як вам карціна?**

— Міхаіл — таленавіты чалавек, але яго фільм пра кампазітара Андрэя Мдзівані мне здаецца лепшым. Я атрымаў задавальненне ад прагляду і на прапанову здымацца паспадзяваўся, што рэжысёр зробіць нешта падобнае, цікавае не толькі мне, але і іншым. Увогуле ў мастацтве я выступаю за мікс элітнасці і дэмакратычнасці. У нас, канешне, элітнае прызванне і нашы каўняры павінныззяць белізной, але ўсё ж мы — не пасланцы Бога.

**— Вялікая ўвага, паколькі гэта з'яўляецца значнай часткай вашага жыцця, у фільме ўдзяляецца рабоце за мяжой. Наколькі наперад распісаны ваш графік?**

— Маё жыццё толькі на трыццаць працэнтаў складаецца з работы за мяжой, а семдзесят працэнтаў — гэта радзіма, Беларусь. Такіх запатрабаваных дырыжораў на постсавецкай прасторы вельмі мала, але арганізавацьь свой час такім чынам, каб нідзе не ўзнікла прэтэнзій і аснoўнае месца работы не раўнавала, магчыма. У мяне ўжо ёсць замежныя прапановы на 2022 год. Тэатр оперы і балета таксама склаў расклад, які ўключае маю занятасць, да 2022-га. Планы філармоніі ў большай ступені належаць сённяшняму дню. Нядаўна наш аркестр атрымаў прапанову аб вялікіх гастролях у лютым — сакавіку. Для мяне гэта ўжо ўчора, але тым не менш я вымушаны мяняць планы, бо ў нас няма магчымасці адмаўляцца ад замежных паездак: за кошт сутачных, што запрашаючы бок плаціць у валюце, аркестр можа зарабіць, а ў нашых эканамічных умовах для музыканта гэта важна.

**— А ганарар?**

— Аркестр атрымлівае толькі сутачныя, а ганарар прыязджае ў банк і кладзецца на рахунак філармоніі — ён невялікі, але ўсё яшчэ прымушае не адмаўляцца ад паездак, хоць і даводзіцца пераглядаць дамашні расклад. Калі, напрыклад, мы задумалі выкананне сімфоніі Малера, якая патрабуе поўнага саставу музыкантаў, тобок амаль сто чалавек, сыграць яе будзе ўжо немагчыма. З тымі, хто застаецца, мы можам дазволіць сабе музыку XIX стагоддзя, сучасную накштал Стравінскага і Месіяна альбо музіцыраванне ў Малой зале. Калі запрашаецца склад аркестра, які адпавядае нашаму пашпарту і назве, я ўзначальваю паездку і раблю сур'ёзную праграму: такія гастролі былі ў Японіі, Эстоніі, Кітаі, мы выступалі ў маскоўскай, вільнюскай і варшаўскай філармоніях. А калі гаворка ідзе пра камерцыйныя паездкі, у якіх удзельнічае невялікая колькасць музыкантаў, скажам, пяцьдзясят, яны праходзяць без мяне і патрэбныя проста для падтрымкі эканамічнага духу нашых музыкантаў.

**— Калі ў мяне здараецца рабочая паездка, працэс вяртання становіцца цэлай гісторыяй. Што вы адчуваеце, калі вяртаецеся з-за мяжы?**

— Я вяртаюся з радасцю і, як правіла, пачуццём задавальнення. Цікавыя замежныя праекты я мару ўвасобіць у Мінску, асабліва вострым гэтае жаданне бывае ў дачыненні да оперных пастановак. Такіх, як «Сіла лёсу» Вердзі, якую я дырыжыраваў у Гамбургу і пра якую ў адной нямецкай рэцэнзіі напісалі: «Маэстра Анісімаў — у галаве і сэрцы». Альбо незвычайны «Яўген Анегін», якога я паставіў у парыжскай Оперы Бастыліі, і французская газета напісала: «Беларус узяў Бастылію». Я дырыжыраваў «Атэла» ў Пермі і ў канцэртнай форме з удзелам цудоўных італьянскіх спевакоў і расійскай спявачкі зрабіў яго ў нашай філармоніі. Быў поспех. У горадзе Пусан з карэйскім музыкантам я выконваў канцэрт для альта з аркестрам Шнітке і марыў паўтарыць яго, бо такое сачыненне мала хто можа сыграць, і гэтую мару ажыццявіў. У Львове я рабіў прэм'еру цудоўнага твора Канчэлі для саліруючай скрыпкі і сапрана і паўтарыў гэта ў Мінску — да нас прыехалі цудоўны французскі скрыпач Аліўе Шарле і спявачка Ірына Крыкунова. А за мяжой, нават нягледзячы на фантастычнай прыгажосці музыку, я, канешне, сумую і хачу дакрануцца да любімых сцен.

**— У Беларусі, на жаль, няшмат пляцовак для выканання класічнай музыкі. Калі б іх было больш, вы думаеце, наведвальнік для іх знайшоўся б?**

— Калі публікі хапае на амаль дзесяць дзён фестывалю Башмета, казаць, што Мінск — неасфальтаваная правінцыя, не даводзіцца. На нашых канцэртах падчас «Класікі ля Ратушы» збіралася больш за дзесяць тысяч чалавек, і не таму, што нехта паказвае фокусы і бегае голы, а таму, што гучыць сур'ёзная сімфанічная музыка. Так, канцэрты бясплатныя, але я быў сведкам, як на выступленнях з вольным уваходам прысутнічала паўтары тысячы слухачоў. У нашу апошнюю праграму я наўмысна не ўключыў ніводнай аперэтачнай мелодыі і ніводнага хіта з «рэпертуара Гары Потэра» — прыём быў надзвычайны. Праўда, у Мінску гэта адзіная летняя акенца для класічнай музыкі, і гэта няправільна, еўрапейскі горад абавязаны мець летні акадэмічны музычны фестываль. У Францыі іх каля пяцісот, гарады гудзяць як вулей, у кожным большменш прыдатным для акустыкі двары гучыць музыка. Канешне, не Лондан, які ўжо ледзь не сто гадоў у Каралеўскім Альберт-Холе амаль на дзве тысячы чалавек праводзіць васьмітыднёвы фестываль «Промс». І не Берлін, дзе арганізуюцца штогадовыя канцэрты на Лясной сцэне, і не Нью-Ёрк, дзе паслухаць сімфанічную музыку ў парку прыходзіць сто тысяч чалавек. У гэтых гарадах ёсць пэўныя традыцыі, але не можа быць, каб у Беларусі, дзе ў кожнага пана ў кожнай вёсцы быў свой аркестр і ў кожным замку рабіліся прадстаўленні, гэтыя традыцыі памерлі. Каб такі фестываль быў, некаму трэба проста праявіць волю. Накont яго я некалі біўся галавой у Міністэрстве культуры, і нам гатовы былі адшпіліць дзесяць мільёнаў, але з гэтымі грашыма мы б нічога не змаглі зрабіць.

**— Вы казалі пра традыцыю, але яшчэ адносна нядаўна, у бытнасць Савецкага Саюза, класічная музыка была фактычна ўзята на ўзбраенне з паўсюднымі філармоніямі і выязнымі канцэртамі.**

— Правільна, я тады яшчэ не працаваў у мінскай філармоніі, але бачыў у архівах, што аркестр, капэла, салісты раз'язджалі па ўсім Савецкім Саюзе, не кажучы ўжо пра абавязковыя Гродна, Гомель і Магілёў. Калі ты не паставіў птушачку, што быў у Брэсце, табе пагражаў скандал. Натуральна, расходы запрашаючы бок альбо браў на сябе, альбо дзяліў напалову з філармоніяй. Я таксама хачу выступіць у Гродне, Гомелі і Магілёве — у іх няма грошай, каб нас запрасіць, а ехаць маленькім саставам, каб аблягчыць іх долю і даць сэканоміць, — не наш профіль. Праўда, дзякуючы такім падзеям, як Міжнародны фестываль імя Салерtынскага ў Віцебску, сродкі знаходзяцца, і мы збіраемся паехаць туды з сур'ёзнай музыкай.

**— Значыць, традыцыі ў нас усё ж захоўваюцца.**

— Цепляцца *(смяецца)*. Брэст, бывае, арганізуе «Калядныя вечары»: раней мы маглі даць не адзін канцэрт, а два, а цяпер нас просяць: «Калі ласка, прыязджайце і тут жа ноччу з'язджайце». Мы кажам: «Мы павінны прыехаць у складзе хаця б васьмідзесяці чалавек», — «Не-не, калі ласка, у нас няма такіх грошай, максімум пяцьдзясят пяць». Вось так у нас усё развіваецца. Затое Маскоўская філармонія альбо кітайцы знаходзяць сродкі, каб нас запрасіць і аплаціць наш райдар.

**— Атрымліваецца, падзенне папулярнасці класічнай музыкі адносіцца толькі да Беларусі?**

— Я не сказаў бы, што гэта падзенне папулярнасці, — гэта ўзыходжанне эканамічных складанасцяў. Я магу параўнаць з Расіяй, бо там бываю: Маскоўская філармонія займаецца арганізацыяй гастроляў не проста маскоўскіх, а ўвогуле расійскіх калектываў; у Міністэрстве культуры цэлы аддзел адказвае за месячныя туры сур'ёзных аркестраў па расійскай глыбінцы. Ёсць грошы і ўсведамленне таго, што апроч алімпійскіх гульняў у Сочы важна, каб Міжнародны конкурс імя Чайкоўскага таксама быў на вышыні. І нам было б добра мець хаця б бачнасць раўнавагі паміж патрэбным для здароўя і іміджу краіны спортам і музычным мастацтвам, што таксама ёсць імідж краіны. Перад адкрыццём сезона мы атрымалі цудоўнае віншаванне ад сыноў Дзмітрыя Шастаковіча і Івана Салерtынскага, у якім яны пажадалі нам поспехаў на «складаным шляху» сімфанічнага выканання і адзначылі сваю радасць у сувязі з тым, што на адкрыцці мае прагучаць 15-я сімфонія Шастаковіча. А яна сапраўды калі ў нас і выконвалася, то шэсцьдзясят-семдзесят гадоў таму. Цікавасць да Беларусі і нашага аркестра такіх значных людзей паказвае, што мы знаходзімся не ў беспаветранай прасторы. За намі сочаць! *(Смяецца.)*

**— З вашага досведу выступленняў, як ад краіны да краіны мяняецца стаўленне да класікі?**

— Разуменне музыкі і здольнасць ацаніць узровень выканання і інтэрпрэтацыі паўсюль прыкладна аднолькавыя, але рэакцыі могуць здзівіць. Перад канцэртам у Аргенціне мяне папярэдзілі, што трэба будзе выйсці на біс. Я вырашыў сыграць па-дэ-дэ з балета «Шкуўкунок» Чайкоўскага. На біс мы выходзілі тры разы, і ўжо на апошнім акордзе зала зараўла так, што гэта можна было параўнаць толькі з рэакцыяй стадыёна на гол Марадоны. Англічане ў знак ухвалення могуць не толькі пляскаць у далоні, але і тупаць нагамі. Часам сябе паказвае аркестр: па заканчэнні канцэрта ты робіш жэст, які запрашае музыкантаў устаць, а яны не ўстаюць, чым дэманструюць, што поспех выступлення — твая заслуга. Беларуская публіка — вельмі ўдзячная. Бывае, разумееш, што іграецца нешта сярэдняе, але зала ўсё роўна ўстае, гэтая дабрыня ўражвае. А потым думаеш: можа, яны ўстаюць, бо стаміліся сядзець? Можа, яны такім чынам паказваюць, што ўжо час сыходзіць?

**— Вы прыйшлі працаваць у Вялікі тэатр у 1980 годзе, а ў філармонію ў пачатку 2000-х. Як гэтыя ўстановы змяніліся з пачатку вашага з імі знаёмства?**

— Калі мяне запрасілі ў Вялікі тэатр, ён меў высокі ўзровень. Там працавалі цудоўныя спевакі, хоць іх і не было шмат, трупа ледзь набірала дваццаць чалавек, а сёння столькі ўваходзіць толькі ў жаночы састаў. Не заўсёды, як вы ведаеце, колькасць пераходзіць у якасць. Павінен сказаць, аншлаг тады не быў штодзённай з'явай: прэм'еры праходзілі з поўнай залай, а, напрыклад, опера «Тоска» альбо «Сельскі гонар» публіку не збіралі. Цяпер жа адміністрацыя вельмі засмучаецца, калі 10-15 білетаў засталіся непрададзенымі, аншлагі сталі звычайнай з'явай, і гэта адразу падняло фінансавыя магчымасці тэатра і аўтарытэт оперы, бо многія гады гучала, што балет корміць оперу. Тэатр стаў смялей эксперыментаваць: такія спектаклі, як «Травіята» Жагарса альбо «Багема» Цітэля, у тыя часы наўрад ці маглі мець месца. І канешне, аснашчэнне пасля рэканструкцыі дала тэатру больш магчымасцяў і зрабіла жыццё артыста больш камфортным. Што датычыцца філармоніі, наша сцэна як была сцэнай дома культуры, так і засталася. Акустыка як была сярэдняя — не жудасная, але ўсё яшчэ не для сімфанічнага аркестра, так і засталася. Калі мы прыязджаем у нейкую еўрапейскую залу, адчуваем, як шмат страчваем у Мінску. Узровень аркестра падняўся: некалі мы лічылі, што выкананне эцюда Шапэна за дзве з паловай хвіліны — гэта фенаменальна, а цяпер той жа самы эцюд можам паслухаць за паўтары хвіліны. Гэта, канешне, з раздзела кур'ёзаў, але тэхнічнае аснашчэнне музыкантаў сапраўды стала вышэйшае, у нас з'явіліся цудоўныя віртуозы, якія працуюць на другіх і трэціх ролях, дзякуючы інтэрнэту і паездкам за мяжу мы займелі нашмат больш ведаў аб прафесіі і можам рэалізоўваць свае задумы ў большых маштабах. Але ёсць змены і негатыўныя. Калі раней у Вялікі тэатр на оперу прыходзіла дзвесце чалавек, гэта ніяк не адлюстроўвалася на заробку, а калі сёння на канцэрт філармоніі прыйшло менш за семдзесят працэнтаў залы, адміністрацыя лічыць, што музыкантаў трэба пакараць, і здымае працэнт з прэміі. А прэмія — гэта фактычна наш заробак. Я не лічу гэта правільным, бо мы пачынаем кіравацца тым, як запоўніць залу і атрымаць гэтую няшчасную прэмію, і верцім праграму, каб, крый божа, у яе не трапіла нешта малацікавае, што датычыцца і беларускай музыкі. Альбо, калі мы зробім даражэйшыя квіткі, вал будзе меншы, з гэтага вала мы не зможам узяць грошы на запрашэнне замежнага артыста, а мы ўжо і забылі, што гэта такое. Вось так мы круцімся-верцімся, ходзім з працягнутай рукой да спонсараў і нейкім чынам выварочваемся. А раней у Мінск прыязджалі Рыхтэр, Якаў Фліер, хоры, аркестры і вялікія спевакі з-за мяжы, і дзяржава за гэта плаціла.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

*Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 16 октября 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 55 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

**Условие продажи: 1)** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2)** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3)** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %**

**Местонахождение лотов №:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8. **Информация о земельном участке:** лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006001208** общей площадью **1,6216 га (право аренды, доля в праве 631/1000). Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации и обслуживания здания контрольно-пропускного пункта и складского помещения

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона — 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-166469**, общей площадью **953,9** кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **здание специализированное автомобильного транспорта. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8/2. **В состав лота № 1 входит:** Недвижимые улучшения – Ограждение территории ПМК-94 (забор бетонный h-2м, L-3м, протяженность 231 м), (инв. № 1004). Инженерные сети – сети ливневой канализации (асбестоцементные трубы d-300 мм, L- 104 м, d-150 мм, L-7 м, глубина заложения 2 м) (инв. № 681). Инженерные сети – сети электроснабжения (АВВГ 4х16, L- 285 м по стене здания; АВВГ 4х10, L- 85 м, воздушная, по 3 ж. б. опорам; АВВГ 4х35, L- 73 м; АВВГ 4х25, L- 32 м, по стене зданий) (инв. № 1694). Асфальтобетонное покрытие, площадь 8392 $м^2$ (инв. № 16). Биотуалет (инв. № 987). Нагреватель дизельный непрямого нагрева Kroil MA-55 (инв. № 5491/1207130212). Тепловая дизельная пушка напр. 26 квт 400 м МОН 26М (инв. № 699). Трансформатор сварочный ТДМ (инв. № 5052). Трансформатор сварочный ТДМ (инв. № 5504). Сварочный выпрямитель ВД 301УЗ (инв. № 517) | **146 826,00** | 7 341,30 | 14 682,60 |
| 6 | Блок-контейнер 6,0х2,45 м (на шасси) инв. № 687 | **1 215,00** | 60,75 | 121,50 |
| 7 | Блок-контейнер 6,0х2,45 м (на шасси), инв. № 686 | **1 215,00** | 60,75 | 121,50 |
| 13 | Вагон-дом 7,9 м х 2,7 м х 2,5 м (на шасси), инв. № 181 | **1 305,00** | 65,25 | 130,50 |
| 14 | Вагон-бытовка 6,9х 2,5х3,04 м (на шасси) инв. № 20029 | **1 395,00** | 69,75 | 139,50 |
| 15 | Вагон-дом 6,9 х 2,5 х 3,04 м (на шасси), инв. № 2026 | **1 395,00** | 69,75 | 139,50 |
| 16 | Эстакада автомобильная 10,0 х 2 колеи: 0,8 м и 0,85 м. инв. № 1166 | **1 620,00** | 81,00 | 162,00 |
| 17 | Легковой автомобиль **VOLKSWAGEN PASSAT**, 2006 г. выпуска, регистрационный номер **1069 ВК-3**, идентификационный номер (помер кузова) WVWZZZ3CZ7P025258 | **5 490,00** | 274,50 | 549,00 |
| 19 | Станция насосная мод. 834/24В, инв. № 6911/6000000324PR. Станция штукатурная ШС-4/6 (СО-50-АМ), инв. № 5466 | **1 665,00** | 83,25 | 166,50 |
| 20 | Установка для выдачи и перемешивания раствора У 342М, инв. № 698 | **1 080,00** | 54,00 | 108,00 |
| 21 | Штукатурная станция СШ-6 СО 50АМ, инв. № 5460/993 | **1 350,00** | 67,50 | 135,00 |
| 22 | Штукатурная станция СШ-6 СО 50АМ, инв. № 665/119 | **1 350,00** | 67,50 | 135,00 |
| 24 | Установка для приема товарного бетона УВР-4, инв. № 6922 | **1 485,00** | 74,25 | 148,50 |
| 26 | Грузовой специальный автобетоносмеситель **КАМАЗ 65115**, кузов (рама) № X6S58147D80004993, XTC65115381158996, 2008 года выпуска, рег. знак **АЕ 1627-3** | **10 440,00** | 522,00 | 1 044,00 |
| 27 | Грузовой специальный автобетоносмеситель **КАМАЗ 65115 Д3**, кузов (рама) № X6S58147Z80004894, XTC65115382337529, 2008 года выпуска, рег. знак **АЕ 0630-3** | **10 440,00** | 522,00 | 1 044,00 |
| 29 | Каток вибрационный **АМКОДОР 6622А**, заводской (серийный, идентификационный) № 0409031, 2009 года выпуска, рег. знак **ЕВ-3 2671** | **16 380,00** | 819,00 | 1 638,00 |
| 30 | Каток самоходный вибрационный **АМКОДОР 6712 В**, заводской (серийный, идентификационный) № 04100041, 2010 года выпуска, рег. знак **ЕК-3 2024** | **19 305,00** | 965,25 | 1 930,50 |
| 40 | **Автомобиль ГАЗ 27057**, кузов (рама) № 27050080400053, X9627057080624555, 2008 года выпуска, рег. знак **АВ 8108-3** | **1 890,00** | 94,50 | 189,00 |
| 41 | **Автомобиль ГАЗ 32213**, кузов (рама) № 32210080405730, X9632213080629823, 2008 года выпуска, рег. знак **АВ 8107-3** | **1 980,00** | 99,00 | 198,00 |
| 42 | **Автомобиль ГАЗ 32213**, кузов (рама) № 32210070332363, X9632213070556845, 2007 года выпуска, рег. знак **АВ 1164-3** | **1 575,00** | 78,75 | 157,50 |
| 45 | Грузовой самосвал **МАЗ 5551А2 325**, кузов (рама) № Y3M5551A290001554, 2008 года выпуска, рег. знак **АВ 8972-3** | **8 370,00** | 418,50 | 837,00 |
| 47 | Грузовой самосвал **МАЗ 5551А2 323**, кузов (рама) № Y3M5551A290001858, 2009 года выпуска, рег. знак **АЕ 2412-3** | **8 235,00** | 411,75 | 823,50 |
| 48 | **Седельный тягач МАЗ 6422А8 330**, кузов (рама) № Y3M6422A890001369, 2009 года выпуска, рег. знак **АЕ 2413-3** | **13 590,00** | 679,50 | 1 359,00 |
| 49 | **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2012**, кузов (рама) №Y3M97580090011654, 2009 года выпуска, рег. знак **А 3917 А-3.** Кассета для перевозки камня силикатного (металлические поддоны с резиновыми ремнями) инв. № 24700667. **Седельный тягач МАЗ 6422А8 330**, кузов (рама) № Y3M6422A890001184, 2008 года выпуска, рег. знак **АI 3268-3** | **17 977,50** | 898,88 | 1 797,75 |
| 50 | Автомобиль **ГАЗ 2705**, кузов (рама) № 27050080403768, X9627050080627713, 2008 года выпуска, рег. знак **АЕ 0554-3** | **1 800,00** | 90,00 | 180,00 |
| 51 | Автомобиль **ГАЗ 32213**, кузов (рама) № 32210070294545, X9632213070519523, 2006 года выпуска, рег. знак **АА 9356-3** | **1 620,00** | 81,00 | 162,00 |
| 52 | Автомобиль **ГАЗ 32213**, кузов (рама) № 32210070297691, X9632213070522452, 2007 года выпуска, рег. знак **АА 9355-3** | **1 935,00** | 96,75 | 193,50 |
| 53 | Грузовой самосвал **МАЗ 555102 220**, кузов (рама) № Y3M55510260009651, 2006 года выпуска, рег. знак **АА 6165-3** | **4 725,00** | 236,25 | 472,50 |
| 54 | Грузовой самосвал **МАЗ 555102 220**, кузов (рама) № Y3M55510260009644, 2006 года выпуска, рег. знак **АА 6166-3** | **4 725,00** | 236,25 | 472,50 |
| 55 | Грузовой самосвал **МАЗ 555102 220**, кузов (рама) № Y3M55510260009602, 2006 года выпуска, рег. знак **АА 6139-3** | **4 725,00** | 236,25 | 472,50 |
| 56 | Грузовой самосвал **МАЗ 5551А2 325**, кузов (рама) № Y3M5551A290001569, 2008 года выпуска, рег. знак **АI 1945-3** | **8 370,00** | 418,50 | 837,00 |
| 57 | Грузовой самосвал **МАЗ 5551А2 325**, кузов (рама) № Y3M5551A290001573, 2008 года выпуска, рег. знак **АI 1201-3** | **8 370,00** | 418,50 | 837,00 |
| 58 | Седельный тягач **МАЗ 6422А8 332**, кузов (рама) № Y3M6422A890001381, 2009 года выпуска, рег. знак **АЕ 2430-3.** Полуприцеп бортовой **МАЗ 938660 044**, кузов (рама) № Y3M93866080009760, 2008 года выпуска, рег. знак **А 3204 А-3**. Кассета для перевозки камня силикатного (металлические поддоны резиновыми ремнями), инв. № 27400668 | **18 288,00** | 914,40 | 1 828,80 |
| 59 | Автомобиль **ГАЗ 32213**, кузов (рама) № 32210090408797, X9632213090632814, 2008 года выпуска, рег. знак **АЕ 0552-3** | **1 845,00** | 92,25 | 184,50 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 — управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: **1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»): Р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693**, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 30 сентября 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 14 октября 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127—129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.03.2019 г. № 60 (28927). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## Извещение о проведении 29 октября 2019 года торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. № 500/С-16562 (наименование — корпус № 1 (лит. А 2-3/к), назначение — здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения)), общей площадью 5 189 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-6590 (наименование — корпус № 2 (лит 2/к)), назначение — здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), общей площадью 1 778 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-699 (наименование — корпус № 3 (лит. В 2/к)), назначение — здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), общей площадью 956 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-8845 (наименование — корпус № 4 (лит Б 1-2/к)), назначение — здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), общей площадью 724 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-26037 (наименование — склад (лит. З 1/к)), назначение — здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общей площадью 26 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-25294 (наименование — компрессорная), назначение — здание нежилое, общей площадью 60 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-26036 (наименование — здание КПП), назначение — здание нежилое, общей площадью 5 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-22908 (наименование — склад (лит. Ж 1/к)), назначение — здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общей площадью 143 кв. м; капитальное строение с инв. №500/С-6419 (наименование — здание заводоуправления (лит. Д 1/д), назначение — здание нежилое, общей площадью 78 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-16563 (наименование — трансформаторная (лит. Е 1/к)), назначение — здание специализированное энергетики, общей площадью 40 кв. м; изолированное помещение с инв. №500/D-798797245 (наименование — производственное помещение), общей площадью 1922,6 кв. м; элементы благоустройства к капитальному строению с инв. № 500/С-24516 (литер а — проезд, литер б — дворовое покрытие, литер в — площадка, литер г — проезд, литер д — открытая крановая эстакада, литер е — площадка, литер ж — площадка, литер и — площадка, литер к — площадка под навес, литер л — площадка, литер м — площадка под навес, литер н — площадка под навес, литер п — площадка под навес, литер р — площадка, литер с — площадка, литер т — площадка, литер у — площадка, литер ф — площадка, литер х — площадка, литер ц — дорожка, литер ч — площадка, литер ш — площадка, литер э — площадка под навес, литер ю — площадка, литер я — площадка под навес, литер аа — дорожка, литер аб — дорожка, литер ав — дорожка, литер аг — площадка, литер ад — подпорная стена, литер ае — подпорная стена, литер аж — подпорная стена, литер аи — ограждение, литер ак — ограждение, литер ал — ограждение, литер ам — ограждение, литер ан — ворота, литер ап — ворота, литер ар — ворота, литер ас — ворота, литер ат — ворота, литер ау — ворота, литер аф — ворота, литер ах — калитка, литер ац — шлагбаум, литер ач — бордюр, литер ач — бордюр); капитальное строение с инв. № 500/С-1026690 (наименование — пожарный резервуар) общей площадью 28,3 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026898 (наименование — кабельная линия 6 кВ) протяженностью 161,4 м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026897 (наименование — газопровод) протяженностью 211,6 м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026809 (наименование — хозяйственно-питьевая водопроводная сеть) протяженностью 171,7 м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026808 (наименование — хозяйственно-бытовая канализационная сеть) протяженностью 489,4 м |
| **Местонахождение: г. Минск, пр-т Машерова, д. 15** |
| **Сведения о земельном участке: кадастровый номер 500000000007000686, площадь — 1,8918 га** |
| **Начальная цена: 8 044 352,67 бел. руб. без учета НДС** |
| **Сумма задатка: 800 000,00 бел. руб.** |

**Продавец имущества:** ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ», пр-т Машерова, 15, 220029, г. Минск, т. (017) 292-73-88.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 0,5 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **29 октября 2019** года в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 30.09.2019 по 25.10.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам — до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(029) 693-45-06 (ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ»).

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

НАВАСЁЛКІ
ДРАГІЧЫНСКАГА
РАЁНА

# ЖЫЦЦЁ ЗА ПАРОМНАЙ ПЕРАПРАВАЙ



**Вось так заедзеш у самую глыбінку і нечакана для сябе адкрыеш невядомыя старонкі гісторыі апошняй вайны. Нават з падручнікаў мы ведаем, што многія вёскі ў лясах палілі, жыхароў на месцы расстрэльвалі альбо нават палілі зажыва, а ў гета трымалі яўрэйскае насельніцтва, каб потым знішчыць. Але ж, відаць, формы і метады расправы ў карнікаў былі надта разнастайныя. Зоя Алехнік расказвае, што жыхароў іх маленькай вёскі Галік, што побач з Навасёлкамі, вывезлі паромам на гэты бок канала і зрабілі нешта накшталт гета, жанчын трымалі ў адным з дамоў у Антопалі, мужчын — у Драгічыне...**

## ВЕЗЛІ НА ЗНІШЧЭННЕ



Праз Дняпроўска-Бугскі канал паромам перапраўляліся заўсёды. Раней, згадвае 80-гадовая Зоя Андрэеўна, паром быў у іншым месцы, цяпер переправа падыходзіць да галоўнай вуліцы ў Навасёлках, а хата нашай гераіні найбліжэйшая да парома. Дык вось, Зоя тады была зусім маленькая, але самыя першыя ўспаміны звязаны менавіта з вайной, са страхам. Недзе гэтыя ўспаміны трывала ўпляліся ў расказы бацькоў, і цяпер цяжка размежаваць, што сама помніць, а што ведае з расказаў старэйшых. Але ж добра ведае, што рабілася ў тыя страшныя гады. У бацькоў была вялікая сям'я, дзевяць дзяцей, жылі дружна, не гаравалі. За каналам у лесе, дзе схавалася іх маленькая вёска, людзі заўсёды адно аднаго падтрымлівалі. Тут неяк адразу ўзніклі першыя партызанскія атрады, спрыяльная абстаноўка. Старэйшы брат Зоі адным з першых у вёсцы сышоў у партызаны. Цяпер яна разважае, што дарэмна такі малады, неабстраляны юнак ірваўся на вайну, яго стрыечны брат падбіў. Так і злажыў галаву 17-гадовы хлопец, не спазнаўшы жыцця.

— А бацька мой быў разумны чалавек, — разважае жанчына. — Ён разумеў, што навакольную партызанку акупанты жыхарам не даруюць. І ўнутрана рыхтаваўся да магчымых уцёкаў. Але ж усё роўна, калі прыйшлі немцы і загадалі ўсім ісці да парома, бацькі разгубіліся, пайшлі з усімі. Многія людзі верылі, што іх проста перасяляць, збіралі пажыткі, выганялі з хлявоў жывёлу. Бацька пастараўся дамовіцца з адным з немцаў, падкупіў нечым, нешта даў загадзя падрыхтаванае. І яго разам з сям'ёй пакінулі нібы падганяць жывёлу, пераправіць скаціну іншым паромам, пасля людзей. Так мы не папалі разам з усімі ў гэтыя дамы-гета, — згадвае Зоя Андрэеўна. — Але там была мая бабуля разам з іншымі жанчынамі, мама насіла ёй перадачы. Некаторы час патрымалі людзей у Антопалі, у Драгічыне, а потым пагрузілі ў таварныя вагоны і некуды павезлі. Адны казалі, што ў Кобрыне расстралялі, іншыя — нібыта іх завезлі ў канцэнтрацыйны лагер і спалілі ў газавых камерах. Словам, ніхто дакладна не ведае, дзе людзі прапалі: ні магілы няма, ні звестак. Навасёлкі таксама тады спалілі, а людзей вывезлі...

Цяжка ўсё гэта ўспамінаць, — уздыхае Зоя Андрэеўна. — Нейкі час цясніліся ў сваякоў, потым жылі ў зямлянках. А пасля ўжо нават палонныя немцы дапамагалі жыллё будаваць. Памятаю, як двое з іх на нашым полі бульбу капалі. Бацька з іншымі мужчынамі ішлі і заўважылі, а той, хто іх ахоўваў, дае майму бацьку вялікую палку і кажа: «Можаш біць». Але бацька кія не ўзяў, разумеў, што з голаду яны пайшлі тую бульбу капаць. Яшчэ помню, як партызаны расстрэльвалі тых, хто пайшоў у паліцыю служыць, расстрэльвалі разам з сем'ямі... Страшная вайна была, любая вайна — нялюдская справа, унукам так кажу і праўнукам: галоўнае, каб яны ніколі не ўбачылі войнаў.

## ГАРТАЮЧЫ СТАРЫЯ АЛЬБОМЫ

Не сказаць, што Зоя Алехнік пражыла лёгкае жыццё. Замуж выйшла рана, у 18 гадоў, адна за адной нарадзіліся пяць дачок. Але сямейнае жыццё не складвалася, бо занадта часта гаспадар зазіраў у чарку. Разышліся з ім. І дзяцей уздымала, і на рабоце паспявала, даяркай у калгасе была доўгі час. Але ж ніколі не ўпадала ў роспач, заўсёды спявала. Колькі сябе помніць, удзельнічала ў калгаснай самадзейнасці, раней у іх пры клубе быў фальклорны калектыў. Усе дажынкі, зажынкі, святы вёскі, мерапрыемствы ў суседніх калгасах і сельсаветах без іх прыпевак і танцаў не абыходзіліся. Цяпер калектыў па зразумелых прычынах распаўся.

А ў яе застаўся толькі велізарны стос фотаздымкаў. Зоя Андрэеўна дастае з шуфляды свае альбомы і пачынае экскурс у гісторыю гастрольнай дзейнасці іх калектыву. Да кожнай фатаграфіі яна дае грунтоўны каментарый. Вось справаздачна-выбарны сход калгаса, і яна — на сцэне з музыкантам, а вось свята на дзень працаўнікоў сельскай гаспадаркі, і выступае іх былы фальклорны калектыў у прыгожых касцюмах. А тут на раённым мерапрыемстве гаспадыня з Навасёлак стаіць побач з караваем, спечаным сваімі рукамі. Яшчэ адзін кадр зрабілі, калі начальнік райаддзела культуры ўручае ёй памятны сувенір як актыўнай удзельніцы самадзейнасці. «Вунь тая крыштальная ваза для цукерак яшчэ стаіць», — паказвае на прыгожую пасудзіну памаладзелая ад прыемных успамінаў гаспадыня.

## ПЕСНЯ — НА ПАМЯЦЬ

Пытаю, ці часта перабірае-праглядвае яна гэтыя здымкі, і чую ў адказ, што не надта часта, але ж, бывае, захочацца згадаць. Спяваць цяпер не выпадае, як раней, дык хоць паглядзець, успомніць сяброўак па выступленнях. Хоць і заспяваць, калі ёсць нагода, яна ніколі не супраць. А раней нават зажынаць першы сноп у калгасе без яе не пачыналі. «Аднойчы, — успамінае суразмоўніца, — брат з Сочы прыехаў, сядзім за сталом, а тут загадчык клуба прыбягае: «Андрэеўна, там камбайн стаіць, жанчыны з сярпамі прыйшлі, ніхто ж і коласа не сажне, пакуль вы зажыначную не заспяваеце». Ну, я і пайшла. Потым вяртаюся дадому, а брат кажа: «Можа, і нам заспяваеш тое, што ў полі?» Я, вядома, заспявала, не звяртала ўвагі, што ён тыкаў пальцам у нейкую маленькую скрыначку на падаконніку. А калі скончыла песню, ён уключыў — аказваецца, запісаў мой голас на магнітафон. Сказаў — на памяць. Колькі гадоў прайшло з той пары!

Брат мой быў вельмі добры ўрач, нейрахірург. Калі прыязджаў пагасціць, усе людзі з акругі ішлі нібы да знахара якога, усім даваў парады, стараўся нечым дапамагчы. Няма ўжо яго. Пахаваны ў Сочы, другі брат пахаваны ў Архангельску, яшчэ адзін — у Саратаве. Усю вялікую сям'ю майго бацькі раскідаў лёс па свеце, — расказвае далей жанчына.

## САМАЯ БАГАТАЯ Ў АКРУЗЕ

А вось мая сям'я ўся пры мне, усе дочкі ўладкаваліся ў Брэсцкай вобласці. Старэйшая працуе ў Брэсце ў бібліятэцы пры абласной бальніцы. Тамара ў Астромічах Кобрынскага раёна загадвае домам культуры. О, яна сапраўдны работнік культуры, іграе, спявае, арганізоўвае святы! Адна дачка жыве побач са мной. Праўда, муж яе нядаўна перажыў абшырны інфаркт, цяпер праходзіць рэабілітацыю. Перажываю за іх. Усе дочкі выраслі прыстойнымі людзьмі, сталі добрымі маці сямействаў. Усе зяці таксама добрыя, працавітыя. Што яшчэ трэба? Пенсію атрымліваю добрую, каб не дзецям дапамагаць, не ведаю, куды б гэтыя грошы дзявала, — смяецца пенсіянерка.

— Да гэтай пары дапамагаеце? — задаю амаль правакацыйнае пытанне.

— А вы хіба не чулі такую показку: што гэта за маці, якая дзяцей да пенсіі не пракорміць? — зусім па-маладому смяецца Зоя Андрэеўна. І расказвае, як нядаўна з адным паромшчыкам размаўляла. Разгаварыліся, ён часова працаваў, даўно тут не быў, спытаў пра яе, а потым сказаў дзяжурнае: «Я вас і не пазнаў адразу. Багатая будзеце». А яна ў адказ: «А я і так багатая на ўсю акругу: пяць дачок, пяць зяцёў, дзевяць унукаў, адзінаццаць праўнукаў».

— Ну і праўда, — згадзіўся паромшчык — тут ніхто не параўнаецца з вамі.

Зоя Андрэеўна выйшла правесці нас за веснічкі. Хадзіць ёй ужо цяжкавата, а вось вышыванне стала цяпер любімым заняткам. Вышывае сурвэткі, ручнікі і дорыць унукам і праўнукам, якія даволі часта прыязджаюць. Так што ёсць нагода паглядваць на паром.

## ПЕРАПРАВА

Паром з даўніх часоў уплывае на жыццё тых, хто пасяліўся на гэтым беразе канала. Хоць і працуе паромная пераправа кругласутачна ў летні час, а зімой пераправай служыць баржа, вёска паступова стала згасаць. Нават рыбгас, які знаходзіцца ў Навасёлках, сітуацыю не ратаваў. Раней нават домікі для працаўнікоў рыбгаса будавалі, цяпер яны стаяць пустыя. Работнікі рыбнай гаспадаркі купілі або пабудавалі жыллё ў іншых населеных пунктах ды пераехалі. Ды і сам рыбгас цяпер не ў бліскучым фінансавым становішчы. А ў сяле жыве легенда, што ў лепшыя савецкія часы хацелі пабудаваць мост, а кіраўніцтва рыбгаса пахавала ідэю, бо баяліся, што стане многа ахвотных красці рыбу. Так гэта ці не, дакладна ніхто не ведае, але мост не сталі ўзводзіць, і вёска паступова абмялела. Цяпер у Навасёлках пастаянна пражываюць шматдзетная сям'я мясцовага фермера, дачка Зоі Андрэеўны з мужам ды некалькі пажылых пенсіянераў. Праўда, частку дамоў купілі рыбаловы-аматары, каб было куды заехаць у сезон рыбалкі.

Старшыня сельскага Савета Міхаіл Шчэрбач расказаў, што вясковую хату тут, здаралася, набывалі за 300 ці 500 долараў у эквіваленце, хоць у іншых населеных пунктах на беразе канала, там, дзе ёсць цвёрдая дарога, цэны даходзяць да 10 тысяч умоўных адзінак. Краявіды ж і магчымасці для адпачынку наўкол аднолькавыя. Толькі калі ёсць выбар, большасць выбірае жыццё без пераправы. А вось для замежнікаў гэты паром — экзотыка, асабліва тутэйшы, на механічнай цязе. У іншых месцах паромы на матарах, а тут металічным вяслом цягнуць канат. Калі хто з турыстаў заязджае, то з задавальненнем фатаграфуе гэты працэс.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ТРЭНІНГ ДЛЯ КІРОЎЦАЎ

**Гамяльчане, якія маюць інваліднасць і перасоўваюцца на калясках, правялі трэнінг для кіроўцаў аўтобусаў. Ён прайшоў у аўтобусным парку № 6 у межах праекта «Даступнае асяроддзе — інклюзіўная Беларусь».**

Каля 30 кіроўцаў практыкаваліся ў дапамозе калясачнікам на аўтобусе з нізкай падлогай. Такіх у гэтым аўтапарку — чвэрць. Папярэдне ўключылі гідраўліку і апусцілі апарэль. Інваліды-спінальнікі прадэманстравалі, якім чынам яны заязджаюць у аўтобус. Таксама расказалі, як правільна закаціць і выкаціць калясачніка па нахільнай платформе, і агучылі асноўныя памылкі і меры бяспекі пры гэтых дзеяннях. Прапанавалі таксама занесці чалавека на калясцы ў транспартны сродак.

Каб навучанне было больш паспяховае, ахвотнікаў з кіроўцаў садзілі ў каляску, каб тыя паспрабавалі самастойна заехаць у транспарт. Як высветлілася, гэта зусім няпроста. Спінальнік і спартсмен Аляксандр Цімафееў кажа:

— Нават самым трэніраваным часам нялёгка, што казаць пра дзяўчыну ці чалавека сталага ўзросту. Паколькі ў нас не паўсюдна абсталяваны прыпынкі па дзяржстандартах, нават мне часам даводзіцца чакаць, каб хтосьці дапамог.

Дарэчы, большасць кіроўцаў аўтобусаў ведае, як дапамагаць людзям з фізічнымі асаблівасцямі. Напрыклад, Мікалай Пшонаў, які ездзіць па маршруце № 25, за адзінаццаць гадоў не раз заносіў калясачнікаў у транспарт:

— Наогул, калі сярод пасажыраў ёсць слабыя людзі ці калясачнікі, кандуктар даведваецца загадзя, дзе яны выходзяць, і паведамляе. У такім выпадку даўжэй стаю на прыпынку і дапамагаю выйсці.



Аналагічныя трэнінгі з кіроўцамі аўтобусаў і тралейбусаў інструктары Гомельскага абласнога грамадскага таварыства «Інваліды-спінальнікі» праводзяць штогод.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ЖЫВЫ КУТОК ВЯЛІКАГА ГОРАДА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэта менавіта гарадскі заапарк, сюды можна без праблем трапіць з любога пункта Гродна. І для прыезджых таксама зручна, бо заапарк знаходзіцца побач з чыгуначным вакзалам, — гаворыць Алег Ігаравіч.

А яшчэ — гэта цэнтр аховы жывёл, вывучэння і захавання генафонду відаў, якія ўтрымліваюцца ў няволі. Пры заапарку працуе дзіцячы гурток «Зубраня». Для гэтага адведзены спецыяльны двухпавярховы будынак. На першым паверсе — жывы куток, дзе дзеці вучацца правільна дагледзець малых жывёл. На другім — аўдыторыі, там ідуць заняткі. Навуковы супрацоўнікі ў год праводзяць у школах амаль 270 лекцый. Кожныя выхадныя заапарк арганізуе тэматычныя мерапрыемствы і святы.

## ТАМ, ДЗЕ БЫЎ ВЕЛАТРЭК...

А вось 90 гадоў таму, у 1929 годзе, тут была гарадская ваколіца з закінутым велатрэкам. А яшчэ ў горадзе меліся аматары жывёльнага свету. Кіраваў заалагічным аддзелам малады выкладчык мужчынскай гімназіі Ян Каханоўскі. Дзякуючы яго намаганням, мясцовыя ўлады выдзелілі тэрыторыю былога велатрэка пад першы заалагічны сад. Дарэчы, ён быў на грамадскіх пачатках, існаваў на ахвяраванні жыхароў. У той час калекцыя налічвала 17 відаў, пераважна мясцовай фаўны. А першым насельнікам стаў паранены бабёр, якога гімназісты вылечылі і выхадзілі.

У вайну амаль усе будынкі заапарка былі разбураны, найбольш каштоўныя жывёлы вывезены ў Кёнігсберг, многія загінулі. Ян Каханоўскі трапіў у лік 100 заложнікаў, якіх фашысты планавалі расстраляць за забойства нямецкага ўрача. Пасля звароту мясцовых жыхароў 75 чалавек адпусцілі, у тым ліку і Каханоўскага. Але ў «чорны» спіс трапіў яго сябар — настаўнік, бацька шасцярых дзяцей Вявюрскі. Тады Каханоўскі прасіў шэфа гестапа адпусціць сябра і забраць замест яго... Імем Яна Каханоўскага названа вуліца непадалёку ад заапарка. А на самім будынку ўстаноўлены яго барэльеф.



Пасля вызвалення горада мясцовыя ўлады прынялі рашэнне аб узнаўленні заапарка. Праўда, на пачатку ў ім было ўсяго некалькі жывёлін, у тым ліку паўлін. Для наведвання аб'ект адкрылі пазней, у 1946 годзе. Цікава, што ў гэтыя гады заапарк нават выконваў дзяржпастаўкі. Напрыклад, збожжа трэба было здаць 125 кілаграмаў, малака — 174 літры.

## КЛОПАТНАЯ ГАСПАДАРКА

Цяпер у заапарку больш за тры тысячы насельнікаў — ад зуброй да хамячкоў. На іх утрыманне патрэбна нямала сродкаў. Больш за ўсё за год ідзе круп — да 15 тон. Рыбы патрэбна чатыры тоны, па дзве тоны — мяса, бульбы і яблыкаў. Сотні кілаграмаў павідла, пячэння, сухафруктаў, арэхаў. А яшчэ дзясяткі тысяч яек, пяць тон малака...Толькі адзін тыгр з'ядае ў дзень шэсць-сем кілаграмаў мяса. Сродкі на ўтрыманне выдаткоўвае бюджэт, дапамагаюць спонсары, але заапарк і сам зарабляе. Тут праводзяць платныя кансультацыі, лекцыі, экскурсіі... На тэрыторыі ёсць некалькі платных атракцыёнаў, працуе кафэ з комплекснымі абедамі і святочнымі праграмамі. Дадатковыя білеты трэба ўзяць, каб пакатацца на поні і наведаць «Бабулін дворык» — невялічкі кантактны заапарк.

— Большая частка рэсурсаў заапарка — гэта ўласныя сродкі, — з гонарам гаворыць Алег Жданкін. — Апошнім часам ніводнай жывёлы мы не купілі за бюджэтныя грошы. І кармы самі купляем. І калі людзі кажуць, што ў нас нятанныя білеты, я адказваю: жывёлы таксама хочуць есці, і іх трэба дагледзець.

Пры заапарку ёсць свая крама, дзе можна набыць невялічкіх істот — тых жа хамячкоў. Прадавац жывёлін у міні-заапарку і аграсядзібы дырэктар не імкнецца. Лічыць, што там іх утрыманне не заўсёды адпаведнае, асабліва кармленне.



Кадравая палітыка — брацька на работу тых, хто любіць жывёл.

— У першую чаргу звяртаю ўвагу, як чалавек абыходзіцца з жывёламі. Важна, каб ён не дапускаў грубасці, не быў узлаваны, — кажа Алег Жданкін.

Праўда, такіх дырэктар за сваю дзесяцігадовую работу не прыпомніць. Хоць кадры патрэбны. Напрыклад, зараз шукаюць заатэхніка з вопытам работы, а яшчэ — навуковага супрацоўніка...

## ТАКІН, ЯГУАР І... СВОЙСКІ КАЗЁЛ

Жывёлы тут асаблівыя — з пашпартамі. У кожнай свая мянушка, свая біяграфія, увогуле, на кожную заведзена асабовая справа. Ёсць і рэдкія экзэмпляры. Напрыклад, сычуаньскі такін. Толькі 30 заапаркаў свету могуць пахваліцца такой жывёлінай. Гэта самае малавывучанае капытнае ў свеце, бо насяляе цяжкадаступныя раёны Кітая і вядзе начны вобраз жыцця. Таму ўбачыць гэты від у жывой прыродзе вельмі складана.

Львіцу засталі за абедам. Каб зрабіць добры здымак, набліжаюся да самай клеткі. Драпежніца толькі вачыма павяла. А вось да клеткі з леапардам было загадана не падыходзіць вельмі блізка — яго рэакцыя можа быць вельмі хуткай. У заапарку ён жыве другі год, а да гэтага быў у Празе, потым у Роўна. Непадалёку вальер з чорным ягуарам, які вырас тут, у заапарку, куды яго прывезлі яшчэ малым. Ёсць пума, пара львоў і пара тыграў. Па словах дырэктара, лінія каціных драпежнікаў укамплектаваная.

Асаблівая гісторыя звязана з ваўкамі. Іх малымі прывезлі замест тых, што загінулі з-за прарыву цеплатрасы. Нават мянушкі ў іх адпаведныя — Петра і Цяплон. Ваўкі выраслі і пасябравалі з дырэктарам, ён свабодна заходзіць да іх у вальер, гладзіць, тузае. На такую «фамільярнасць» тут больш ніхто не прэтэндуе.

Яшчэ адзін цікавы экзэмпляр. Не экзотыка, але вельмі фактурная асоба з вялікімі крутымі рагамі.

— Гэта наш Сярога. У яго вельмі ганарлівы выгляд. Хоць трапіў да нас проста з падворка. Гаспадары не мелі куды падзець і аддалі на ўтрыманне, гэта свойскі казёл. Ён знаходзіцца тут са сваімі сяброўкамі, — расказвае Алег Жданкін.

Бывае, што прыносяць траўмаваных жывёл — зайцоў, лісічак, вожыкаў. Нямала ў гэтым спісе busлоў. Птушак пасля таго як яны падужэюць, выпускаюць у прыроду, туды, дзе ім месца. Але з'явіліся ўжо і гарадскія буслы. Адзін з іх звіў гняздо над арліным вальерам.

— Ён, відаць, пралятаючы міма, убачыў тут мноства буслоў. Пачаў прылятаць да нашай самкі, але, на жаль, яна не магла лётаць. Тады бусел знайшоў сабе іншую сяброўку, і яны пасяліліся тут у гняздзе. Вось сёлета было двое буслянят. І гэтыя буслы, відаць, пачалі лётаць па горадзе — яны ж ужо гарадскія. Людзі тэлефануюць: ратуйце птушак. Я кажу: не чапайце іх, няхай сабе лётаюць. Мяркую, што на наступны год прыляціць яшчэ больш буслоў, якія стануць «гарадскімі», — заўважае Алег Ігаравіч.

У асобным вальеры жыве «двортэр'ер» Ліза. Гэта памочніца вартаўніка, з ім яна па начах абыходзіць тэрыторыю. І калі чуе — штосьці не так, пачынае гаўкаць. Але ўдзень выпускаць яе небяспечна, будзе шумець і ганяцца за птушкамі. Лізу спецыяльна ўзялі малым шчанём і выгадавалі для аховы заапарка.

## ХТО АДКАЖА ЗА ДАЎГАБУД?

Дырэктар зазначыў, што калекцыя будзе пашырацца. У прыватнасці, ёсць намер набыць малпаў. Вядуцца перагаворы па капытных. Але многія віды зніклі, і невядома, ці будуць узноўлены.

— Былі раней белыя мядзведзі, тапіры, сланы — цяпер іх няма. Увогуле набыць жывёл складана з-за абмежаванасці базы. Але ёсць і такі парадокс. Можам знайсці сродкі і нават саміх жывёл, але не можам іх прывезці з-за мяжы. Некаторыя жывёлы падпадаюць пад забарону беларускай ветэрынарнай службы, — расказвае Алег Жданкін.

— А канкрэтныя прапановы ёсць, і даволі цікавыя. Нядаўна заапарку хацелі аддаць на ўтрыманне белых насарогаў, а яшчэ раней — жырафу. Там, дзе яны зараз знаходзяцца, няма адпаведных умоў. Экзатычных жывёл можна было б размясціць у сланоўніку, які пустуе. Але, аказваецца, у ім шмат недаробак. Немагчыма засяліць сюды і слана. А некалі іх мелася нават тры ў заапарку. Пакуль будынак не будзе даведзены да нормы, ён так і застанецца пустым.

Такая ж сітуацыя з акварыумам. Спецыяльнае памяшканне са шклянымі вітрынамі пакуль не засяліў, хоць пасля аднаўлення прайшло сем гадоў. Тут нават электрычнасць не праведзена. Будынак, які знаходзіцца каля цэнтральнага ўваходу, прыходзіць у заняпад, яго фасад аблупіўся. І ўсё таму, што да гэтага часу так і не перададзены заапарку. З-за гэтага няма магчымасці разводзіць і экспанаваць рыб і земнаводных.

Затое ў мясцовым вадаёме рыба проста кішыць. Калі стаць на мосцік, сюды плывуць цэлыя касякі карасёў. Якім чынам яны заўважаюць людзей, невядома. Па словах дырэктара, іх тут ніхто не ловіць, не палохае, толькі кормяць. Вось яны і плывуць да мосціка з усіх бакоў.

Дарэчы, вадаём таксама абяцалі добраўпарадкаваць. Зрабіць берагі як у канале. Для вадаплаўных робіцца спецыяльныя сходы. Прычым сучасныя тэхналогіі дазваляюць правесці работу за некалькі дзён. Магчыма, усе недаробкі будуць ліквідаваны... хочацца верыць — не да 100-гадовага юбілею заапарка.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**



Zамор'е

## НОВАЯ БРЫГАДА ВЫРАСЦЕ

Адначасова нарадзілі сем жонак ратавальнікаў адной станцыі

**У амерыканскім горадзе Солсберы, штат Паўночная Караліна, сем жонак пажарных, якія працуюць на адной станцыі, нарадзілі дзяцей прыкладна ў адзін і той жа час, паведамляе партал WNBC.**

Першы раз СМІ звярнулі ўвагу на жанчын у сакавіку, тады ўсе яны былі на розных тэрмінах цяжарнасці і разам зрабілі фатаграфію ў пажарнай форме мужоў. Здымак шырока разышоўся па сацыяльных сетках. У верасні Брыяна Мітчэл, якая зрабіла першую фатаграфію, вырашыла сфатаграфаваць тых жа жанчын разам з іх нованароджанымі дзецьмі. «Не магу паверыць, што прайшло ўжо шэсць месяцаў з моманту, калі быў зроблены той здымак з будучымі мамамі. Час ляціць, і цяпер на пажарнай станцыі пазіруюць шчаслівыя і здаровыя дзеці і іх бацькі», — адзначыла амерыканка. Жанчыны заявілі журналістам, што не збіраліся зацяжарыць адначасова і не ведалі аб планах адна адной завесці дзяцей. «Магчыма, нашы мужы гэта запланавалі», — пажартавала адна з іх.



## АЎТААМАТАР НЕ РАЗГУБІЎСЯ

Немец патушыў пажар півам

**Нямецкі аўтаамaтар патушыў рухавік свайго аўто, якое загарэлася, некалькімі бутэлькамі піва, паведамляе агенцтва Associated Press.**

Мужчына ехаў па аўтабане паблізу горада Хесбах у Баварыі і адчуў дзіўны пах. Пасля ён убачыў языкі полымя пад капотам сваёй машыны. Ён хутка ўзяў некалькі бутэлек піва, якія ляжалі ў салоне ў кейсе і заліў агонь. Пажарныя адрэагавалі на выклік і прыехалі, але ўзгаранне ўжо было патушана з дапамогай толькі пеннага напою.

Раней паведамлялася, што расіянін патушыў узгаранне квасам. Жыхар горада Камень-на-Обі (Алтайскі край) дапамог уладальнікам аўтамабіля Nissan X-Trail, які загарэўся, таксама заліўшы агонь, але гэтым разам — безалкагольным напоем.

**Іван КУПАРВАС.**

# ТРЫВОЖНЫ РАЙ

## Што пагражае Багамам?

**Сёлетні верасень стаў трагічным перыядам для Багамаў. Ураган «Дорыян» прайшоўся па тэрыторыі астраўной дзяржавы. Віхур рэкордной моцы атрымаў найвышэйшую — пятую — катэгорыю небяспекі. Вада падымалася да сямі метраў, а хуткасць ветру набліжалася да 300 кіламетраў у гадзіну! Праз дзень трапічны ўраган аслабеў да чацвёртай катэгорыі. Пасля «Дорыян» накіраваўся да берагоў ЗША і небяспечна наблізіўся да Фларыды. Што адбываецца на Багамах?**

### ПІРАТЫ НА ПЛЫТКАВОДДЗІ

Багамскія астравы (поўная афіцыйная назва — Садружнасць Багамскіх Астравоў) — дзяржава, якая знаходзіцца на поўнач ад Карыбскага мора, на паўднёвы ўсход ад паўвострава Фларыда. У архіпелаг уваходзіць каля 700 астравоў (з іх заселены толькі каля 30) і дзве тысячы каралавых рыфаў. Паходжанне назвы дакладна не ўстаноўлена, існуюць дзве асноўныя гіпотэзы на гэты конт. Паводле адной з іх, назва паходзіць з фразы на мясцовай мове «Taino ba ha ma» («вялікая верхняя сярэдняя зямля»). Як сцвярджаецца ў іншай гіпотэзе, назва ўзнікла з іспанскага словазлучэння «baja mar» («неглыбокае мора» або «адліў»), якое адлюстроўвае плыткаводдзе ў гэтым раёне.

Першымі пасяленцамі на Багамскіх астравах лічацца лукаяны (адсюль назва Лукайскія астравы), адгалінаванне племя аравакаў, якія прыбылі сюды прыблізна ў IX стагоддзі. Тэрыторыю «знайшоў» Хрыстафор Калумб у 1492 годзе. Адзін з астравоў архіпелага — Уотлінга (Сан-Сальвадор) — першая адкрытая іспанцамі зямля Новага Свету. Трыма гадамі пазней каланісты пасяліліся на архіпелагу. Іспанцы вывозілі мясцовых жыхароў на Эспаньёлу (Гаіці) у якасці рабоў, і праз 25 гадоў індзейскае насельніцтва было практычна лiквідавана, а каланізатары пакінулі пасяленне.

Пасля цягам стагоддзя астравы заставаліся малазаселенымі і незапатрабаванымі, пакуль кароль Англіі Карл I не перадаў іх генеральнаму пракурору. У 1650 годзе сюды прыбылі нешматлікія перасяленцы з Бермудскіх астравоў. Тады ж на Багамах атабарыліся піраты, якія стварылі свае базы для адпачынку і рамонту караблёў. Марскіх разбойнікаў выгналі англічане ў 1718 годзе. Так Багамы сталі брытанскай калоніяй.



Тут спрабавалі арганізоўваць трысняговыя плантацыі на амерыканскі ўзор, але паколькі глеба была не надта ўрадлівая, большасць «сельгаспраектаў» перастала існаваць у першыя ж гады. Затое «выстраліў» турызм — заможныя амерыканцы ахвотна раскашэльваліся на адпачынак у трапічным раю. У 1920 годзе грошы ўвогуле хлынулі ў краіну ракой: пасля прыняцця ў ЗША «сухога закона» на астравах актывізаваліся кантрабандысты. Багамы былі ідэальнай платформай для незаконнага забеспячэння Штатаў алкаголем, і неўзабаве Насау стаў велізарным складам рому. У багамскай сталіцы ўкладвалі значныя сродкі ў будаўніцтва, з'яўлялася вялікая колькасць гатэляў. Адмена «сухога закона» ў ЗША ў 1933 годзе прывяла Багамы да Вялікай дэпрэсіі. Гэтак жа як і ў Злучаных Штатах, Другая сусветная вайна назначыла канец эканамічнага спаду. У той час многія амерыканскія ваенныя прыязджалі на астравы для адпачынку, што істотна паляпшала эканоміку краіны.



### ПАМІЖ ШТОРМАМ І ЎРАГАНАМ

Пасля кубінскай рэвалюцыі ў 1959 годзе Багамы апынуліся ў выгадным становішчы з прычыны таго, што многія заходнія вандроўнікі былі вымушаныя адмовіцца ад курортаў на Кубе. У Насау пашырылася амерыканская база ВПС, каб прымаць міжнародныя авіярэйсы, быў абноўлены порт і пачалася актыўная рэкламная кампанія. Уздым дабрабыту спраакаваў развіццё партыйнай сістэмы і абвастрэнне этнічных трэнняў, бо белая эліта атрымала велізарныя даходы ад турызму, у той час як чорная большасць так і заставалася за рысай беднасці.

Прагрэсіўная Ліберальная Партыя, якую падтрымлівала чорнае насельніцтва, прыйшла да ўлады ў 1967 годзе і паклала канец панаванню белых. Краіна ўступіла на шлях здабыцця самастойнасці. У 1964-м, у адпаведнасці з новай Канстытуцыяй, астравам было дадзена ўнутранае самакіраванне, з 10 ліпеня 1973 года — незалежнасць. Праўда, краўніком дзяржавы дасюль застаецца брытанскі манарх. Спробы рэформаў ад лібералаў прывялі да зніжэння кошту нерухомай маёмасці і спынення эканамічнага росту. Партыйныя лідары загразлі ў карупцыі, некаторыя з іх былі ўцягнутыя ў міжнародны наркагандаль. Пасля дапамогі ЗША, аказанай для спынення наркатрафіку ў 1980-х, і выбараў адміністрацыі, якая прадстаўляе інтарэсы дзелавых колаў (Свабодны нацыянальны рух), у 1992 годзе Багамскія астравы пачалі паступова адраджацца.

Але ўмяшалася стыхія. Увогуле Багамы рэгулярна пакутуюць ад ураганаў і трапічных штармоў. Так, у 1992 годзе чацвёра загінулі падчас урагану «Эндру». У 1999-м ураганы «Дэніс» і «Флойд» (апошні суправаджаўся больш чым 15-метровымі хвалямі) прайшліся па астравах, разбурыўшы дамы, дарогі, рыфы і курорты. Да 2001-га ўрон быў ліквідаваны, і Багамы зноў набылі прывабнасць для турыстаў. У 2004 годзе дзевяць чалавек загінулі падчас трапічнага шторму «Жанна». У 2016-м, падчас урагану «Мэцью», аэрапорты Багамскіх астравоў былі закрытыя і жыхары прылеглых тэрыторый былі выкліканы ўладамі для перамяшчэння на ўзвышша, каб уратавацца ад паводкі.

### ЧАТЫРЫ МІЛЬЁНЫ ТУРЫСТАЎ

Цяпер насельніцтва Багамскіх астравоў складае каля 385 тысяч чалавек. Большасць — 85 працэнтаў жыхароў — маюць афрыканскія карані. Адсюль да Фларыды рукой падаць — каля паўсотні міль. Паколькі архіпелаг знаходзіцца побач з Ямайкай, Кубай і Гаіці, ён рэгулярна выкарыстоўваецца ў якасці транзітнага пункта для бежанцаў, якія імкнуцца дабрацца да Злучаных Штатаў. Паводле звестак Міжнароднай Арганізацыі па міграцыі, каля пяці тысяч гаіцян працуе на астравах афіцыйна, але ад 20 да 50 тысяч іх суайчыннікаў знаходзіцца ў краіне нелегальна.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, Багамы — даволі паспяховая краіна. Па паказчыку ВУП на душу насельніцтва яна знаходзілася паміж Іспаніяй і Бахрэйнам. Турызм з'яўляецца асноўнай крыніцай даходу, прычым 80 працэнтаў са штогадовых чатырох мільёнаў наведвальнікаў прыязджае са Злучаных Штатаў. На гэты сектар прыпадае 60 працэнтаў ад больш чым 12 мільярдаў долараў ВУП, і ў ім занятая палова людзей працаздольнага ўзросту. Галоўнай славутасцю Багамаў з'яўляецца Atlantis Paradise Island, велізарны турыстычны комплекс насупраць Насау.



Краіна моцна пацярпела ад фінансавага крызісу 2008 года. З тых часоў рост аднавіўся, але застаецца слабым, склаўшы 1,4 працэнта ў 2017-м. Праз нізкія падаткі банкаўская справа з'яўляецца другім па велічыні сектарам эканомікі краіны, на долю якога прыпадае пятая частка ВУП. У 2000 годзе Багамскія астравы былі аднесены да катэгорыі падатковых гаваняў, а ў красавіку 2010-га яны былі выкраслены з шэрага спісу краін Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР).

Архіпелаг прыцягвае шматлікіх славутасцяў — ад шатландскага акцёра Шона Конеры, даўняга рэзідэнта з падатковых меркаванняў, да амерыканца Джоні Дэпа, які валодае тут прыватным востравам. Нью-ёркскі музыкант Лені Кравіц лічыць астравы сваім домам і адасабляецца для творчасці — менавіта тут ён зводзіў свой апошні альбом.

### «ВАДА ЗАБРАЛА ІХ»

Урон ад «Дорыяна» складзе ад 25 да 40 мільярдаў долараў, што зробіць яго самым дарагім ураганам апошніх гадоў, паведаміла агенцтва Bloomberg са спасылкай на прагноз аналітыкаў UBS Group. Што ж датычыцца Багамаў, то страты ад «рэкорднай» стыхіі тут унушальныя. Паводле ацэнак Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа, да 45 працэнтаў дамоў на астравах Вялікі Багама і Абака былі часткова або цалкам разбураныя. Звыш 60 тысяч чалавек мае патрэбу ў ежы і пітной вадзе, адзначаюць у ААН, загінулі дзясяткі людзей, каля 1,5 тысячы лічацца прапалымі без вестак.

Па словах кіраўніка групы USAID па аказанні дапамогі ў выпадку стыхійных бедстваў Роба Джэнкінса, супрацоўнікі агенцтва дапамагаюць ураду правяраць спісы імёнаў, каб ідэнтыфікаваць сапраўды зніклых людзей. Таксама ён дадаў, што USAID пераходзіць да аказання доўгатэрміновай падтрымкі, такой як пошук пастаяннага жылля для пацярпелых, аднаўленне школ і расчыстка тэрыторыі астравоў ад смецця. Як адзначылі ў міністэрстве турызму Багамскіх астравоў, «ніколі ў гісторыі мы не бачылі ветру 200 міль у гадзіну». Мясцовы жыхар напісаў у «Твітэры» з Паўночных Багамаў: «Некаторыя людзі не змаглі выратавацца. Вада забрала іх». На думку другога месіча, «Багамскія астравы ператварыліся ў краіну трэцяга свету».

Эксперты адзначаюць, што цяпер цяжка ацаніць, колькі часу спатрэбіцца, каб забяспечыць жыллём усіх, каму яно неабходна. Паводле ацэнак фірмы Karen Clark&3, страты маёмасці без уліку інфраструктуры і аўтамабіляў, могуць скласці сем мільярдаў долараў.

